**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ”**

**У.А. Бобрык, Н.П. Малашанка**

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА. СІНТАКСІС

*Заданні да кантрольных работ*

**Гомель 2007**

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ"**

**У.А. Бобрык, Н.П. Малашанка**

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА.
# СІНТАКСІС

***Заданні да кантрольных работ
для студэнтаў завочнага факультэта
спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія»***

**Гомель 2007**

УДК ?????????
ББК ???????
Б ????

Рэцэнзенты:
????????, дацэнт, кандыдат філалагічных навук;
кафедра беларускай мовы ўстановы адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны"

Рэкамендавана да друку навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны"

Бобрык, У.А.

Б ??? Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс [Тэкст]: заданні да кантрольных работ для студэнтаў завочнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія" / У.А. Бобрык, Н.П. Малашанка; Мін-ва адук. РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны. – Гомель: УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2007. – ?????? с.

Заданні да кантрольнай работы ахопліваюць асноўныя тэмы сінтаксісу: "Словазлучэнне", "Просты двухсастаўны сказ", "Просты аднасастаўны сказ", "Галоўныя члены сказа", "Даданыя члены сказа", "Просты ўскладнены сказ", "Складаны сказ". Прызначаны для студэнтаў завочнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія".

УДК ????????
ББК ?????????????????

© У.А. Бобрык, 2007
© УА "ГДУ імя Ф.Скарыны", 2007

# ЗМЕСТ

Уводзіны.........................................................................
Заданні для выканання.......................................................
Схема разбору словазлучэння.............................................
Схема разбору простага сказа...........................................
Схема разбору складанага сказа.........................................
Узоры выканання заданняў...............................................
Літаратура.........................................................................
Прыкладны пералік пытанняў да экзамену па курсу
“Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс”..............................

# УВОДЗІНЫ

Кантрольныя работы – адна з форм самастойная працы студэнта, абавязковы кампанент вучэбных планаў завочнага факультэта вышэйшай навучальнай установы. Мэта напісання кантрольнай работы – засвоіць і ўдасканаліць тэарэтычныя веды па пэўнай дысцыпліне, выявіць уменне выкарыстоўваць набытыя веды на практыцы.

Задачы вывучэння курса беларускай мовы для студэнтаў завочнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія" – дапамагчы студэнтам авалодаць нацыянальнай мовай беларускага народа, выпрацаваць маўленчыя навыкі, засвоіць асноўныя тэарэтычныя і практычныя пытанні па сінтаксісе, павысіць пісьменнасць і культуру мовы, развіць здольнасць самастойна даследаваць шматлікія моўныя з'явы.

У сувязі з гэтымі задачамі ў працэсе навучання беларускай мове студэнт-завочнік павінен засвоіць тэарэтычныя пытанні сінтаксісу як вучэння аб словазлучэннях і сказах, іх структуры і тыпах, навучыцца выкарыстоўваць атрыманыя веды для рашэння пэўнай лінгвістычнай задачы, класіфікаваць моўны матэрыял, аналізаваць словазлучэнні і сказы і г.д.

Кантрольная работа прысвечана аналізу сінтаксічнага ладу сучаснай беларускай мовы. Асноўная ўвага надаецца разгляду тыпаў словазлучэння, характарыстыцы сказа па ўсіх яго кваліфікацыйных прыметах: па мэце выказвання, па эмацыянальнай афарбоўцы, па колькасці граматычных частак, па характару прэдыкатыўнай асновы, па наяўнасці або адсутнасці даданых членаў сказа, па ступені паўнаты, неабходнай для дадзенай стуктуры сказа, па наяўнасці або адсутнасці кампанетаў, якія ўскладняюць сказ.

Перш чым выконваць працу, студэнт-завочнік павінен дэталёва пазнаёміцца з заданнямі, метадычнымі парадамі, вывучыць адпаведную літаратуру. Толькі пасля гэтага ён можа прыступіць да выканання заданняў.

Заданні ў кантрольнай рабоце адзіныя для ўсіх студэнтаў, за выключэннем апошняга, і выконваюцца імі па падабраных тэкстах.

Заданні да кантрольнай работы ахопліваюць асноўныя тэмы сінтаксісу: "Словазлучэнне", "Просты двухсастаўны сказ", "Просты аднасастаўны сказ", "Галоўныя члены сказа", "Даданыя члены сказа", "Аднародны члены сказа", "Адасобленыя члены сказа", "Пабочныя і

ўстаўныя канструкцыі”, “Складаны сказ”. Прызначаны для студэнтаў завочнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія”.

## ЗАДАННІ ДЛЯ ВЫКАНАННЯ

**<u>Заданне 1.</u>** З мастацкай літаратуры падабраць тэкст на 120-150 слоў, каб у ім былі аднасастаўныя, складаназлучаныя і складаназалежныя сказы. Выпісаць з тэксту 10 словазлучэнняў і зрабіць іх сінтаксічны разбор (аналіз праводзіць па схеме).

**<u>Заданне 2.</u>** Падкрэсліць дзейнікі ў тэксце, вызначыць іх структурныя тыпы і спосабы выражэння.

**<u>Заданне 3.</u>** Вызначыць у тэксце тыпы выказнікаў, падкрэсліць іх. Выказнікі ў адпаведнасці з іх выражэннем занесці ў табліцу. Калі ў тэксце яны адсутнічаюць, то выпісаць сказы з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку, і занесці ў табліцу.

Табліца 1. Просты дзеяслоўны выказнік і яго выражэнне

| Асабовая форма дзеяслова | Інфінітыў | Выклічнікавая форма дзеяслова | Аналітычная форма | Ускладненая форма | Сінтаксічна непадзел. словазл., фразеалагізм, перыфраза |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Табліца 2. Састаўны дзеяслоўны выказнік

| Звязка | | | | Прызвязачны член | |
|---|---|---|---|---|---|
| Фазавы дзеяслоў | Дзеяслоў з мадальным значэннем | Іменная часціна мовы | Сінтаксічна непадзельнае словазлучэнне | Інфінітыў | Непадзельнае словазлучэнне, фразеалагізм |

Табліца 3. Састаўны іменны выказнік

| Звязка | | | | Прызвязачны член | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тыповая | | Паўзнаменальная | Знаменальная | Назоўнік | Прыметнік | Дзеепрыметнік | Займеннік | Лічэбнік | Прыслоўе | Сінтаксічна непадз. словазлучэнне, фразеалагізм |
| матэр. выражаная | нулявая | | | | | | | | | |

**<u>Заданне 4.</u>** Выпісаць з тэксту аднасастаўныя сказы, падкрэсліць галоўны член. Вызначыць тып аднасастаўнага сказа і спосаб выражэння ў ім галоўнага члена (у дужках пасля кожнага сказа). Калі

аднасастаўны сказ з’яўляецца часткай складанага сказа, то трэба выпісаць увесь складаны сказ і падкрэсліць у ім частку, якая пабудавана як аднасастаўны сказ. Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то на кожны тып аднасастаўных сказаў падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

**Заданне 5.** Выпісаць з тэксту два сказы з аднароднымі і два сказы з неаднароднымі азначэннямі. Растлумачыць умовы аднароднасці і прычыны неаднароднасці азначэнняў у сказах (у дужках пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

**Заданне 6.** Выпісаць з тэксту тры сказы з адасобленымі азначэннямі ў розным становішчы да азначаемага слова, растлумачыць умовы адасаблення (пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

**Заданне 7.** Выпісаць з тэксту два сказы з пабочнымі і два сказы з устаўнымі канструкцыямі. Растлумачыць іх значэнне і ўжыванне пры іх знакаў прыпынку (пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

**Заданне 8.** Выпісаць з тэксту чатыры складаназлучаныя сказы, назваць і падкрэсліць злучнікі, вызначыць адносіны паміж часткамі. Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

**Заданне 9.** Выпісаць з тэксту чатыры складаназалежныя сказы, назваць і падкрэсліць злучнікі і злучальныя словы, вызначыць адносіны паміж часткамі (пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

**Заданне 10.** Спісаць сказ, паставіць знакі прыпынку, зрабіць поўны сінтаксічны разбор складанага сказа.

## *СКАЗЫ ДА ЗАДАННЯ 10*

1. Радзіма гэта і сонца ў цябе над галавою і паветра якім дыхаем гэта і вернасць твайго друга і мова якую табе народ і песня што засталася ад прадзедаў і легенда заўтрашняга твайго дня і гераічная слава бацькоў і тая сонечная дарога якой сёння мы ідзем горда ў сваю будучыню (К. Кірэенка).

2. Гэтыя вёскі амаль поўнасцю заселены беларусамі і таму няма ніякага дзіва калі людзі сабраўшыся разам на вяселле ці на хрэсьбіны нейкім далёкім вельмі шчымлівым і падсвядомым інстынктам успамінаюць сваю радзіму і тады ў бяседу прыходзяць нашы беларускія песні прывезеныя дзядулямі і бабулямі з той далёкай дарогі песні ад якіх вельмі ж ласкавее кожнае застолле (Я. Сіпакоў).

3. Дзе-нідзе пападаліся кучаравыя круглыя кусты лазы сям-там пракідаліся высокія пышныя алешыны а ў суседстве з імі красаваліся дзве прыўдалыя хвоі здавалася што гэта дзве маладзіцы што пайшлі па ваду ды загаварыліся а загаварыўшыся так і засталіся (Я. Колас).

4. Асабліва востра гэты сум адчуваецца вечарамі ў полі калі дзённыя клопаты аціхнуць а зямля ляжыць спакойна і стоена быццам у прадчуванні нечага вялікага і невядомага што павінна здарыцца (А. Кудравец).

5. Самы лепшы час у вясне той калі пачынаюць распускацца бярозавыя лісточкі і няма лепшай музыкі калі высока ў гары гойдае-песціць лёгенькі цёплы ветрык гэтыя пахучыя лісточкі маладзенькія прыгожыя поўныя жыцця і радасці калі прырода звонам птушыных галасоў і шумам раслін складае хвалебныя песні сонцу (Я. Колас).

6. Добра пайсці ў лес аднаму ўбіцца ў глухі хмызняк над Дняпром і моўчкі слухаць як у сівым кудлатым тумане над соннай вадой б'юцца прыгожыя гукі як растаюць яны водгуллем недзе там за Дняпром дзе спяць сенажаці дзе адгукаецца на песню адзін аднастайны крык дзеркача (М. Зарэцкі).

7. Бясформенны абшар лужка дзялілі спачатку палоскамі ўпоперак і заўсёды яшчэ заставаўся трохкутнік паміж полем і выганам кавалак які ўжо нельга было падзяліць і які называўся мусіць вельмі здаўна Гуртавое (Я. Брыль).

8. У першыя мінуты калі Міхась Ланкевіч пачуў што пачалася вайна і пасля калі ён слухаў прамоўцаў на паспешліва сабраным мітынгу ля калгаснай канцылярыі і яшчэ пазней калі ён стаяў пад акном клуба слухаючы ўрачыстыя маршы па радыё і выступленні

слаўных людзей яго душу перапаўнялі супярэчлівыя пачуцці (А. Асіпенка).

9. Калі падумаеш глыбей прыгледзішся больш уважліва і пільна дык аказваецца што Радзіма гэта і тыя добрыя людзі з якімі ты ўступіў у жыццё якія заўсёды гатовы пайсці табе на дапамогу і дзеля якіх сам ты гатовы на ўсё самае скрушнае і цяжкае нават на смерць (К. Кірэенка).

10. Зваліўся б камень з плеч каб знаў што можаш прыйсці ты ў дом не толькі ў дзень пагожы але і ў навальнічны час трывожны калі дажджы ўсе ў дождж адзін збяруцца калі ўсе беды з ланцугоў сарвуцца (М. Танк).

11. Я доўга з нейкай лянівою абыякавасцю глядзеў на шырокія дрэвы на густое зялёнае лісце папудранае пылам на яблыні якія яшчэ не паспелі і якія адным выглядам сваім наганялі аскоміну на грушы якія пабрала ўжо чырвоная сыпка на пабялелы блакіт што млеў угары над невысокім драўляным домам і ціхім садам (І. Чыгрынаў).

12. Калі пасля працяглай паездкі вяртаешся ў горад у якім жывеш і які лічыш родным усё здаецца табе тут інакшым чым ты пакідаў як быццам і людзей на вуліцах стала больш і рух аўтамашын і трамваяў жвавейшы пашырэлі вуліцы і плошчы пасвятлелі сцены будынкаў прыбавілася дрэў і кветак на бульварах у парках і скверах (Т. Хадкевіч).

13. Стаяла на дзіва прыгожая раніца якія бываюць у канцы жніўня калі з поля ўжо звезена ўсё да апошняга снапа калі грамаздзяцца на лугах парыжэлыя ўжо стагі сена калі шпакі лятаюць над полем а які-небудзь тэлефонны дрот ад слупа да слупа ўнізаны так густа ластаўкамі што аж угінаюцца пад ім (М. Лынькоў).

14. Адразу прыходзіць радасная прасветласць на ўсё пачынаеш глядзець інакшымі вачыма і здзіўляешся што ў гарадскім тлуме прапускаеш праходзіш міма і не заўважаеш як свежа востра-зялёна блішчыць пасля дажджу трава што несамавітая радзенькая бярозка якая расце пад акном голая і зграбная... (Дзятлаў).

15. Калі я падыходзіў да белых вежаў яснапалянскіх варот у душы маёй з кожным крокам расла тая гордая радасць якую пранеслі сюды многія тысячы той неспакой захаплення і тая трывога што нават Чэхава прымусілі павярнуць свае коні ад гэтых варот... (Я. Брыль).

16. Люблю пазіраць у празрыстыя струмені восенню калі ўсцілае раку жоўтае лісце бяроз і вольхаў што густа стаяць абапал ракі калі са свістам праносяцца нізка над вадою апошнія чародкі дзікіх качак і

ціхі сум тонкім павуціннем павісае над пацямнелымі журботнымі паплавамі (М. Ваданосаў).

17. Творы Янкі Купалы абуджаюць светлае жаданне ўбачыць увачавідкі тыя мясціны што ўзгадавалі яго тыя сцежкі па якіх хадзіў вялікі пясняр выкрасаючы з сэрца асветленыя магутным розумам радкі што ўвабралі ў сябе гэтак шмат народных дум людской журбы радасных спадзяванняў і здзяйсненняў (У. Юрэвіч).

18. Калі ехаў сябры на Кангрэс я да вас мне Радзіма давала ў дарогу наказ гаварыла зямля што не хоча яна каб палі арашала крывёю вайна каб гарматы і танкі ўзрывалі яе каб слязамі сірот засявалі яе (М. Танк).

19. Яна не ведала але здагадвалася што ўчыніла нешта благое бо яна выпіла горкі палыновы ўвар якім лячыла яе маці калі раптам моцна забаліць схапіўшы жывот а нешта гадкае на смак (В. Адамчык).

20. Мажэйка ўспомніў што на другі дзень пасля таго як вярнуўся з вайны ён стаяў на гэтым жа самым узгорку куды яго прывяла зарослая трыпутнікам палявая дарога знаёмая з дзяцінства (У. Шахавец).

21. Я іх [машын] не бачыў яшчэ а ўсё ж калі араў на досвітку вузкі заключаны ў межы загон чуў здавалася грукат адтуль дзе ўзыходзіла сонца дзе шырокае поле аралі стальныя коні (Я. Брыль).

22. Было сыра і холадна неба засцілалі хмары і можа днём збіраўся пайсці дождж бо на беднай радкаватай траве што траплялася на ўбітай зямлі Валіны босыя ногі не адчувалі расы (У. Дамашэвіч).

23. Нават калі Васіль адзін ішоў па вуліцы галоўнай местачковай вуліцы яму яшчэ добра не верылася што ўся тая недарэчная гісторыя скончылася што ён ужо не пад прыглядам варты не арыштант а вольны казак што можа ісці туды куды хоча куды вядзе сэрца (І. Мележ).

24. Карага адчуваў што канвойныя хістаюцца што нешта злучае іх і робіць блізкімі па душы нягледзячы на рознасць характараў і на тыя дарогі жыцця па якіх яны ішлі дагэтуль і якімі хацелі б пайсці далей (Я. Колас).

25. Гарадскі тлум не далятаў на пагорак і вельмі хораша было стаяць там глядзець на бліскучую роўнядзь ракі дыхаць п’янлівым ветрам што заўжды дзьмуў адтуль з той зарэчнай прасторы і адчуваць сваю магутную сілу і ўладу над усім што бачыла вока... (А. Савіцкі).

26. Нічога не адказаўшы ён павярнуўся каб адысціся ды дзе-небудзь прысесці дакурыць люльку але ў гэты час яму пачулася такое слова якога ён ужо даўно-даўно не чуў тое слова якое часта гучала ў сне і ад яго стары кожны раз прачынаўся (А. Кулакоўскі).

27. Я ўдзячны лёсу што з усіх краёў ён выбраў для мяне навекі гэты дзе бальшакі прастуюць між палёў а па сцяжынках коцяцца ранеты дзе Нарач мые сінія шаўкі і п’юць з Дняпра паўдзённыя вясёлкі дзе з салаўямі дражняцца шпакі і жыту голас дораць перапёлкі (Г. Бураўкін).

28. Неяк міжвольна Іваноўскі зрабіўся сведкам як генерал лаяў аднаго палкоўніка за адсутнасць нейкіх дадзеных на ўчастку левага фланга і як пасля гэтага палкоўнік у сваю чаргу разносіў камандзіра разведкі дзве разведгрупы якога не вярталіся з-за лініі фронту хоць мінулі ўсе тэрміны іх вяртання (В. Быкаў).

29. Углядаючыся праз голы затуманены прыцемкамі хмызняк Рыбак усё больш пазнаваў гэтую пуцявіну якую ён памятаў яшчэ з восені калі пад нагамі плюхалі лужыны а ў лесе густа церушыў лістапад і восеньскі вецер імжыў наўкола нудным сцюдзённым дажджом (В. Быкаў).

30. Добрым і сардэчным словам не забудзь ніколі ўспомніць свайго друга-садавода што прывіў лясную дзічку жаўрука які вясною разбудзіў яе пупышкі дождж які паіў карэнні вецер што гайдаў галіны пчол якія апылялі цвет ружовы і духмяны рукі смуглыя дзяўчыны што плады збіралі ўвосень калі будзеш гэты яблык на сваёй трымаць далоні (М. Танк).

31. І гадзіну і другую ішлі ціснулі з двух бакоў магутныя камні чорна звісалі галіны здавалася ніколі не будзе ўжо ні поля ні сонца але нарэшце між дрэваў выблісквала нешта вясёлае а неўзабаве сляпілі вочы вольны прастор радаснае неба воблакі (І. Мележ).

32. Ганна бачыла што ў лесе там і тут тырчалі шырокія жылістыя пні круглыя вярхі якіх былі чорныя шэрыя белаватыя і зусім белыя свежыя і ёй стала шкада столькі тут высечана ўжо гэтых дубоў і вязаў (І. Мележ).

33. Стаяла чэрвеньская ноч калі ў буйной цвецені красуе зямля поўніцца сокам лісцяны змрок лесу і ў цішыні ночы чуваць як распраўляе малады ліст зялёная папараць атрасаючы з сябе засохлую іглiцу як шамаціць вожык пад кустом збіраючыся ў начныя паходы (М. Лынькоў).

34. Жанчына з якой яна амаль параднілася за кароткі час зрабіла незвычайнае ўражанне яна неяк па-свойму па-жаночаму дапоўніла тыя асаблівыя пачуцці якія магчыма упершыню з’явіліся ўвосень перад калючым дротам лагера ці на святы калі Саша кінуў ёй папрок і ёй захацелася адзначыць народнае свята (І. Шамякін).

35. Круглы двор гэта і кузня дзе можна навастрыць сякеру назубіць серп гэта і стальмашня дзе робяцца драбіны для калёс палазы для саней абсада для вокан гэта і бандарня дзе нараджаецца бочка каб саліць агуркі дзяжа каб трымаць у ім жыта гэта і свежая майстэрня дзе бацька расчуліўшыся з ласкаваю ўсмешкаю цэлага паўдня корпаецца каля ліповага палена пакуль яно не зарадуецца прыгожаю цудоўнаю цацкаю (Я. Сіпакоў).

36. Лета для мяне яшчэ там у дзяцінстве назаўсёды прапахла альховай карою з якой мы рабілі лубкі для ягад суніцамі малінаю ды чарніцамі якімі пахлі нашы рукі вусны і нават шапкі у якіх назаўсёды асталіся пачарнелыя крапінкі ад ягад калі мы траплялі на ягадную паляну а браць болей не было куды добрымі кузаўкамі рабіліся тады гэтыя шапкі а для грыбоў сарочкі з завязанымі рукавамі (Я. Сіпакоў).

37. Маёю карціннай галярэяй былі мясцовыя краявіды спакойная Свіслач што ў зарасніках алешніку вілася па забалочаным лузе зялёныя пагоркі за вёскай спярэшчаныя вузкімі сялянскімі палоскамі засеянымі жытам аўсом ці ячменем а далей лес бярэзнік хвойнік асіннік куды ганялі пасвіць кароў і дзе перагукваючыся каб не заблудзіцца збіралі ягады грыбы (А. Бачыла).

38. Крыху засмучаным здаваўся далягляд а ў сэрцы глыбокая як далёкі ўспамін пачынала варушыцца тая даўняя з маленства знаёмая туга якая ахінае чалавека ў пустым восеньскім полі што зняможана і пуста ляжыць шызавата-попельным крылом восеньскага ворыва пацямнелым ад дажджу і быццам выкачаным іржышчы (А. Жук).

39. На другі дзень раніцай калі промні сонца не паспелі запаліць буйныя кроплі расы што віселі на траве на павуцінні-кроснах напнутых паміж галінак арэшніку нават не пафарбавалі чырвоныя верхавіны самых высокіх дубоў Бялькевіч узяў эцюднік і ціха ступаючы каб не разбудзіць сябра скіраваў на тую палянку якую аблюбаваў яшчэ ўчора (Гаўрылкін).

40. У адным месцы Бесядзь якраз там куды ішоў Чубар рабіла круты разварот і правы бераг быў абрывісты глыбінны зе*n*млі спрасаваныя сівой вапнай і рыжай балотнай рудой павіслі над вадой якая шумела ўнізе быццам рака тут раздвойвалася адна спакойна

плыла праз луг між чароту і аеру а другая пракладвала сабе шлях недзе пад зямлёй употай ад людзей (І. Чыгрынаў).

41. Новае месца новыя людзі і тая работа ў школе якую трэба было распачынаць на гэтых днях і да якой ён так доўга рыхтаваўся ўсё гэта займала яго думкі і яму было лёгка і добра бо так многа новага і цікавага спадзяваўся ён спаткаць на першай сваёй дарозе незалежнай грамадскай працы (Я. Колас).

42. Калі Тодара Пошту выклікалі да стала і калі старшыня суда гледзячы яму проста ў вочы і нават насупіўшы трохі ад вялікай сур'ёзнасці свае рыжаватыя бровы папярэдзіў што Пошта павінен гаварыць адну толькі праўду і што за непраўдзівае сведчанне ён будзе пакараны Тодар адчуў што вочы ўсяе залы ўпіраюцца яму ў спіну свідруюць яго дабіраюцца да самых таемных куткоў яго натуры (К. Крапіва).

43. Тыя хто перажыў выпрабаванні калі ўсе твае нервы ўсе найтанчэйшыя твае душэўныя струны напіналіся да вышыні за якою канчаліся паветра і не было чым дыхаць памятаюць што і пасля вайны яшчэ доўга не маглі прывыкнуць што самалёт можа стаць нястрашным (В. Вітка).

44. Мне здаецца што кожны хто хоць раз убачыў і перажыў той час калі зацвітаюць сады праз усё жыццё не можа забыцца як гэта бывае (Я. Сіпакоў).

45. Вечна я ўдзячны жытняму хлебу чыстай вадзе з невялічкай крыніцы лесу зялёнаму сіняму небу светлай рачулцы што ў полі бруіцца гулу кварталаў у сонца затканым дзе я з гадамі ў жыцці гартаваўся плошчам і вуліцам тым несціханым дзе я з сябрамі здружыўся пазнаўся людзям з адкрытай і шчырай душою з кім давялося ў жыцці мне сустрэцца краю што роднай завём мы зямлёю што Беларуссю так люба завецца! (П. Броўка).

46. Расцярушыла ночка свой цёмны пыл распляла над зямлёю свае чорныя косы а сама як маці прытаілася ў лесе каб вартаваць і ахоўваць сон прыроды яна пазмятала з неба ўсе хмаркі і яно заззяла тысячамі рознакаляровых агенчыкаў-зорак (Я. Колас).

47. Тое што ўсё навокал ажыло і загаманіла не толькі ўзнімала яго настрой але і напаўняла сэрца гонарам па маладосці заўсёды схільнай да любавання сабой яму здавалася што хоць і на яго сіла і воля выклікалі да жыцця гэты рух усё ж такі ён былы вясковы хлапчук які калоў ногі тут на ржышчы і цягаў з возера акунькоў стаіць цяпер у цэнтры гэтага ажыўлення і кіруе ім як дырыжор аркестрам.

48. Заняты сваімі думкамі я не чуў як спадала квола шлёпаючы па лісці ў той досвітак раса з дрэў як абуджаліся і пачыналі крычаць славячы прыход новага дня птушкі не бачыў як святлела барвовела на ўсходзе неба як яно з кожнай хвілінай шырэла гнала прэч начныя суцінкі і моракі як спагадзя з-за цёмнай сцяны лесу нібы з-за вялізнай крутой гары вырвалася раптам аднекуль на волю сонца і пераліваючыся асыпаючы ўсё навокал вострымі зыркімі праменнямі паплыло над зямлёю панесла ўсяму жывому цяпло і радасць (Б. Сачанка).

49. Гарачы ліпень лета напалам рассек праменнай шабляю спякоты каб востра пахнуць скошаным лугам адчуць салодкую ламоту каб на зажынках спелым коласам злучыцца ў першы сноп пазалацелы каб засвяціцца радасцю вачам пазнанаю ў далонях запацелых (А. Звонак).

50. Яны ўсё ішлі берагам ціха ахалі задзіралі галовы дзівячыся з дрэў што глядзелі на водную роўнядзь якая часамі пачынала стракацець кругамі хацелі разгледзець дзе ж нарэшце скончыцца гэты роўны прасцяг і пачнецца закругленне залом за якім бераг пачне крута забіраць улева і сыдзецца з тым месцам з якога яны вышлі.

51. Прыемна было ісці і думаць аб усім што траплялася на вочы адзінокай магілцы на ўскрайку дубровы ветраку што махаў крыламі на пагорку нібы тужыўся ўзляцець гуллівай маладзіцы ў бежавай кофтачцы што падвезла на падводзе кіламетраў шэсць старым вартаўніку-пуцейцу што даў прагнаць смагу халоднай вады (Б. Сачанка).

52. Толькі на самоце калі на душы яго спакойна і ціха ці ўжо калі гняце гэтую душу так хоць на сцяну лезь калі распластаўшы ружовыя на сонцы крылы выбліскваючы кожным пяром падрульвае ён задубелымі доўгімі нагамі да сваёй буслянкі вітальнай песняй азначае сваё вяртанне з далёкіх краін (В. Казько).

53. Яшчэ цвілі позпія палявыя кветкі а на месцы тых што адцвілі ў канцы лета даспявала і сеялася на зямлю насенне чорныя шэрыя і жоўтыя зярняты якімі так любяць ласавацца дробныя птушкі шчыглы чыжы (К. Чорны).

54. Аднак дзе б я ні быў якія б цуды ні здзіўлялі перад маімі вачыма заўсёды ззяла прамяністае святло майго роднага мястэчка дзе жылі бацькі і бацькі маіх бацькоў дзе я сам упершыню захапіўся шчодрай сонечнай прамяністасцю пахам кветак на шаўковых мурожных лугах спевам жаваранка які заліваўся ў высокіх сініх нябёсах (М. Хведаровіч).

55. І шчыра прызнаюся што няма для мяне найлепшых хвілін як ехаць дамоў да маці да сваіх землякоў дзе кожнае дрэўца ў лесе кожны сіні васілёк і белы рамонак пры дарозе (В. Дайліда).

56. І наперакор вялікадзяржаўным скептыкам якія не прызнавалі за беларускай мовай яе самастойнасці Багдановіч даказаў што яна ніколькі не бяднейшая і не горшая за іншыя мовы што ёй падуладны ўсе віды і жанры зведаныя і асвоеныя высокаразвітымі літаратурамі і што на ёй можна паспяхова перадаваць найтанчэйшыя адценні чалавечых пачуццяў (А. Бачыла).

57. Нават калі не разглядаць усю біяграфію увесь творчы шлях Якуба Коласа а толькі акінуць вокам якія падзеі адбыліся ў яго жыцці калі стваралася гэтая энцыклапедыя народнага жыцця беларусаў дык і тады мы ўбачым што трэба было быць сапраўдным волатам духу чалавекам вялікай волі і нязломнага характару валодаць мужным і самаахвярным талентам каб слова за словам радок за радком скласці гэты найвялікшы твор нашай паэзіі якім заўсёды будзе ганарыцца беларуская літаратура (В. Вітка).

58. За некалькі дзён баёў у якіх прыняў удзел Агееў ён паспеў пераканацца што ў войска хапала рашучасці супраціўляцца ворагу што байцы і камандзіры без літасці да сябе змагаліся з ворагам часам здорава білі яго на малых участках хаця і не маглі тым змяніць агульную абстаноўку на фронце (В. Быкаў).

59. Пасля першага прымаразку што зашарэў на сухіх саламяных стрэхах і пасля якога ў гародчыках счахлі і пачарнеўшы апалі вяргіні пасля піералётнай навальніцы калі з каламутнага неба завірыў снег і нечакана адазваўся забыты ўжо з лета пярун устрывожыўшы халодным перапалохам душу што не на дабро гэта непрыкметна вярнуліся дні ціхага надвор’я тужлівых замярэжаных сінечай адкрытых даляў чыстай святой яснасці ад жоўта-агністых дзікіх грушаў на калматых быльніковых межах сярод зялёнага ўрунелага жыта (В. Адамчык).

60. Ты доўга думаеш якім святлом якім гарачым словам дарогу к сэрцу кожнага знайсці каб гэтым хлапчукам белагаловым патрэбнай быць заўсёды ў жыцці каб кожны стаў і мужны і шчаслівы каб з ім ты шчаслівая была (С. Грахоўскі).

61. У кліну поля дзе чарнела і бралася за калошы густою шчоткаю пераспелая чарада Ладак Чабоцька вышмаргнуўшы з-за пакругі невялікую з крывенькім тапарышчам сякеру забіваў першы калок умовіўшыся прырэзаць сушэйшага балотца каб выйшла кожнаму па

два гектары верасаўцы пачалі разбіваць увесь надзел на доўгія гоны... (В. Адамчык).

62. Калі выходзілі з Ігнацькавай пасекі сонца ўжо было далёка ад таго месца дзе вынырала ўранні яно вісела ўсё прамяністае без кропелькі чырвані над бярозавым гаем што аж сінеў па той бок калгаснага поля якое горбілася ля самай вёскі і паступова распасціралася за бальшаком адкрываючы далягляд (І. Чыгрынаў).

63. Міця глядзеў на шэрую падзёўбаную дажджамі раллю на клін зялёнай руні што харашыла смутнае пустое поле на замглёныя сіняю смугою грабянцы лесу з жоўтымі губкамі ды прылескамі нізкага грабу і арэшніку на адзінокія з сухаверхімі кронамі хвойкі што аўдавелымі бабкамі да якіх доўга не прыходзіць смерць векавалі на прамежках сярод поля на калючыя дзікія грушы з шурпатымі крывымі камлямі жоўта-бурачковыя або ўжо асыпаныя чорна-згалелыя і ў душы млеў смутак перамешаны з нядужай празрыстай і крохкай радасцю што ён Міця зноў дома што бачыць гэты блізкі свет роднага поля ў палахлівым пырханні смутных жаваранкаў і чуе начамі чорствы жвір дарогі (В. Адамчык).

64. У лесе яшчэ адчувалася ранішняя прахалода зрэдку калі чапляўся хто за куст пырскала па твары раса але і раса і прахалода былі ўжо як падагрэтыя на зямлю паступова асядала духата якая запаўняла сабою дзе толькі можна пустату (І. Чыгрынаў).

65. Ён сцішана ішоў па сухой укамянелай вуліцы чутка слухаў як з высокім водгаласам у рэдкіх садках у згалелых старых прысадах прапахлых гаркаватым лянівым дымам што цягнуўся курэў з ямаў дзе патрэсківалі кастры і дзе сушыўся лён ляскалі збіваючыся з такту звонкія церніцы як крохкім шклом пад нагамі ў мужчын лускаў лядок на высушаных лужынах з бельмамі пустых кругоў (В. Адамчык).

66. Адны нястомныя жаваранкі якія то раптоўна падалі з вышыні то зноў ўзляталі над полем угору званілі ў пабялелым быццам выцвілым небе і іх чуваць было нават тады калі дарога збочвала ў самы лес ды весела як на пажары ціўкалі на бярозах што раслі паабапал палявых дарог вераб’і (І. Чыгрынаў).

67. Шэрая падсушаная замаразкам дарога падымалася то на пагоркі дзе адзінока і мякка шумелі густымі кронамі старавечныя ружавата-шурпатыя хвойкі то стрымгалоў падала ў лагчыну да карычневага ў белых катках лазняку кустоў каліны акропленай чырванню не падзёўбаных яшчэ ягад то мінала чорна-калючыя абсыпаныя ўжо ад жоўта-бурачковага лісця дзікія грушы то бегла глыбокім ярам з

вечназялёным мяккім ялаўцам у чорна-дымных ягадах то лужкамі што зараслі раскідзістымі пучкамі парадзелай конскай цыбулі то абягала даўнейшыя котлішчы з круглым каменнем падмуркаў з зараснікам кашкі здзічэлага бэзу жаўлялых дубцоў малінніку чорна-пераспелага бур'яну з якога чародкамі падымаліся чубатыя жаўтабрухія пташачкі (В. Адамчык).

68. Адна толькі Чэся зрэдку перакідвалася словам і во надоечы няўзнак каб мусіць не ведалі маці з сястрою на двары калі яны вынеслі з хаты выпыліць ды вытрасці ходнікі ды закурэлыя воўчыя шкуры што ляжалі каб было цёпла ўногі каля ложкаў яна адкінула з лоба рыжаватую курчава-упартую кудзерку пaглядзела сваімі прыгожымі валаватымі вачмі на Хрысцю (В. Адамчык).

69. У лесе дык ужо змяркалася сцюдзёны туман і раннія прыцемкі пакрысе праглыналі змакрэлы сасоннік амаль голы з рэштаю зрудзелага лісця падлесак а на палявым прасцягу за гразкай гравійкай было яшчэ светла у твары коннікаў ударыў пругкі вільготны вецер і яны спыніліся (В. Быкаў).

70. Калі ты бачыш на шляхах вазы са збожжам у мяхах двухсотпудовым залатым чытаеш рапартаў радкі што будуць жыць і жыць вякі скажы хвала і слава тым хто слова даў калі араў начэй нямала не даспаў раллі тугія камяні зрабіў рукой мякчэй мукі (П. Панчанка).

71. Міця глядзеў як за пабеленым і ўжо аблезлым ад дажджу плотам за трапяткім шумным прысаддзем што цэлым вадаспадам сыпала лісце хавалася спярэшчаная чорнымі балонкамі хустка і ў душы зварухнулася мяккая чуласць да гэтага шустрага дзяўчаці што нечакана вылюднела ў спрытную прывабную дзяўчыну прыгадаўся той вечар калі яна прыбегла на поплаў наказваць што ў вёсцы з'явіліся паліцыянты і стоячы па той бок рэчкі зманліва насмехвалася і шпурляла разламаўшы папалам жорстка-калючую шчотку спелага сланечніку (В. Адамчык).

72. Адкрытыя прыязныя ўсмешкі простых людзей якія сустрэлі нашу дэлегацыю за Бугам залатая спакойная восень абапал стрункай асфальтавай паласы аратыя што раскашаліся няспешнай працай пад сонейкам позняй восені дзеці-школьнікі і малышы якія на фоне багатай руні на вуліцах вёсак і гарадоў гулліва махалі ручкамі і смяяліся ўжо ўсё гэта было пачаткам той хвалюючай песні якую нам давялося неўзабаве спяваць... (Я. Брыль).

73. На развілцы вуліц тупаватым вуглом на Міцю выплыла двухпавярховая камяніца і ён здрыгануўся ад цвілога і даўняга холаду лядоўні што была вымуравана ў адвары і ў якую іх арыштантаў роснаю з рэдкім імжыстым туманам вераснёваю раніцаю выпхнулі з фурманак выклікаючы потым па адным на допыт (В. Адамчык).

74. Яму добра такі пякло ў шчокі аж неяк туманна рабілася ў вачах ён адхінаў тады галаву і было прыемна адчуваць як доўга яшчэ гарачыня казытала калола твар як роўна разлівалася па шчоках паветра лёгкім токам аблягала твар і ад гэтага неяк прыемна яснілася ў галаве было добра (М. Стральцоў).

75. Брала нават дзіва што слепаватая з вывернутым слязлівым вокам баба прыцікавіла як з-пад рэчкі перабегшы кладку ў свой блізкі і незакончаны дом што ўткнуўшыся блочным падмуркам у стромы бераг крадком вядома пераапрануўшыся ў цывільнае прыходзіць Гура і покуль ён снедае ды кахаецца з жонкаю на надворку калее стоячы напагатове яго сын хлапец гадоў дванаццаці (В. Адамчык).

76. Нейкая панурая зацятасць адзіноты выдавала ў ёй нейкае цярплівае і звыклае трыванне перад усім перад ветрам перад небам якое было святлейшым і вышэйшым там дзе свяціліся вымкнутыя ўгору і застылыя ў тугой нерухомасці голыя шаты і нават ветру не ставала сілы растрывожыць пануры іх спакой і ён злосліва шумеў і шоргаўся ўнізе у трывожлівай цёмнай купе вішань і сліў (М. Стральцоў).

77. Ад блізкай што абрасла вербамі і мармытліва цурчэла пад вузлаватымі карчамі нешырокай у петлях лук рэчкі сюды да алешын палахліва вілася і смутна блішчала аблітая галалёдам сцежка крокаў за дваццаць ад чарады тоўстых алешын праз рэчку ляжала звязаная з дзвюх неакораных сасновых жэрдкаў гнуткая кладачка з гэткаю самаю ненадзейна-слабенькаю парэнчаю (В. Адамчык).

78. Невядома скуль узяўшыся востры непераможна-гарачы сорам ударыў у галаву ў шчокі сэрца забілася холадна цяжка і балюча ён адчуў што зараз вось павінна здарыцца нешта такое пасля чаго ён Іванка будзе ўжо не ён а нехта другі незразумелы невядомы і страшны цяперашнему яму і гэтага нельга было ўжо абысці і нельга спыніць (М. Стральцоў).

79. Дарога ляжала падсінена-белая мяккая хоць бокам каціся мроістая відната праменіла не толькі ад снегу што жаданай абновай абляпіў зямлю дрэвы платы стрэхі ганкі але і ад месяца які даўно не

ззяў гэтак зырка ад зор што абсыпалі неба ад іскрыстага пылку які ледзь прыкметна сеялі ні то зоры ні то дрэвы (В. Карамазаў).

80. Былі сляды ад лютага марозу ад спёкі ад маланак якія выпалілі яму два чорныя шырозыя шрамы нехта раскладаў пад ім вогнішча і нават неаднойчы ад тых вогнішчаў у камлі быў выпалены чорны што ў печы паўкругам чалеснік чыясьці сякера падсякала яму карані-лапы ніжнія тоўстыя галіны былі кручаныя з густымі адна за адной нарасцямі хоць яшчэ ніводзін сук не пакінуў ствол з дуба не выпаў яшчэ не было ніводнага дупла і нягледзячы на ўсе свае калецтвы дуб стаяў зялёны непахісны (В. Карамазаў).

81. Трошкі навастрыўшы слых Агееў адплюшчыў вочы нізкі верх маленькай яго палаткі ўжо яўна выступаў з прыцемкаў сваімі дробязямі матузамі шнуроўкамі на выхадзе размытымі невядома якога паходжання плямамі на парусіне у самым каньку матава свяцілася невялічкая з грывеннік дзірачка нядаўна прапаленая вугальком з кастра (В. Быкаў).

82. Танчэй і казытлівей пахла мякінай свежа і густа чуўся пах гліны пах перамёрзлага току ён бачыў яго выразна карычнева-цёмны загладжаны ток прыбіты цапамі і кранікамі увесь у лусачках-ямачках што пакінула пасля сябе духмянае цвёрдае зерне (М. Стральцоў).

83. Затуманіліся запацелі ад пары нібы заінелі на кухні вокны і мне здалося што на дварэ зіма што я не ў горадзе а недзе ў вёсцы прыйшоў з лазні па рыплівай ад марозу мутнавата-іскрыстай сцежцы бо яшчэ шыза гарыць над лесам халоднае неба кінуў у сенцах мяккі распараны вострапахучы венік адчыніў дзверы ў хату дзе ярка ўскідваецца на камінку агонь і кіпіць на трынозе чыгунок з вадой куды ўжо маці кінула вехцік сухога малінніку (М. Стральцоў).

84. Загаманілі за сталом яшчэ мацней яшчэ бязладней і ўсе глядзелі на Іванку і нехта падштурхоўваў яго ўжо на падлогу імгненне што яшчэ нядаўна адчувалася як бясконцасць як запаволены рух распадалася ірвалася асыпалася як пясок паміж ім Іванкам і застоллем уставала пустата і яму тады неспадзявана радасна прыдалося што нічога страшнага няма ў гэтай пустаце бо раптам адчуў праз яе самога сябе адчуў сябе і застолле ён як бы зазірнуў у сябе і не спалохаўся а ўпэўніўся ў сваёй да часу схаванай сіле (М. Стральцоў).

85. Пачуццё шырокае вольнае кружыла і кружыла яго і ён ужо адчуваў што яму гэтаму пачуццю рабілася цесна ў хаце і зноў зноў нейкая невядомасць насоўвалася на Іванку але не страшная зусім

шырокая і да шчымлівасці звонкая напятая як струна яна клікала вабіла да сябе забірала думкі і што былі перад ёй і гэтая хата і застолле і бабуля што так да шкадавання адзінока роспачна сядзела ўгнуўшыся на сваім прыпечку што перад ёй быў яшчэ нядаўна такі страшны і незразумелы Цяўлік (М. Стральцоў).

86. Сыры і густы вецер падзьмуў па палудні з-за ракі на Выганчык гонячы мокрыя калючыя наабіваныя зялёныя сасновыя іголкі што адмерзлі за зіму ў марозы і тонкую як папера жоўтую сасновую кару з верхалля якая блішчала на зямлі мокнучы на снезе і чарнела ўгары над галавой што сажа дзе яе круціла і глытала як у прорву (І. Пташнікаў).

87. Ён ужо не чуў як праз некалькі хвілін з яго грудзей дасталі гэты востры метал і каб не збягала кроў у маленькую ранку ўваткнулі абматаную кудзеляй драўляную палачку як яго пацягнулі за заднія ногі па двары за хлеў у зацішак як паклалі ўсімі чатырма нагамі на зямлю якую ён толькі што стараўся намацаць і якая калі б ён намацаў яе можа выратавала б павінна была выратаваць яго як у раскрыты рот паклалі невялікі круглы камень як яго абкладвалі сухой саломай нібы хацелі каб яму цяпло было як потым чыркнулі запалкай і паднеслі да саломы агонь і салома доўга не хацела гарэць але ўсё ж пасля трэцяй запалкі заняўся маленькі шматок жоўтага агню (А. Кудравец).

88. Снег пайшоў як хтось нагадаў апоўначы роўна ў дваццаць чатыры гадзіны старога года ці нуль-нуль новага калі ім і ўсяму нашаму народу па радыё і тэлевізары аджадалі ўжо ўсяго самага-самага калі танцы ў клубе Васькавага тэхнікума пазбавіліся ўжо чыннасці і кантролю выкладчыкі паціхеньку па адным і парамі пачалі знікаць з вечара а студэнты засталіся амаль што адны (В. Казько).

89. Яшчэ сон звівае павекі іх цяжка і лянота разарваць і галава яшчэ поўнасцю не прачнулася то прарываючыся да яснасці цвярозага азарэння то патанаючы ў салодкім тумане забыцця а ўжо радасць вяртання ў самога сябе ранейшага малога нейкага другога і разам з тым такога ж самага як і цяпер жыве ва ўсім целе наводзіць на думку аб вялікім нечалавечым шчасці (А. Кудравец).

90. Праўда калі Жэня ўсхвалявана гаварыла ён не пазіраў ў вочы нібы спакойна а на самой справе мусіць узрушана цёр-цёр анучкаю замасленыя рукі моршчыў высокі лоб і моцна сціскаў таўставатыя на першы погляд трошкі непрывабныя але што ні ёсць звычайныя мужчынскія вусны здавалася ці то не ведаў што знянацку адказаць ці то як і кожны муж калі не прыраўноўваў дык адчуваў балючае

шчымленне што яго жонка спачувае свайму былому каханку (Г. Далідовіч).

91. Гэтая няяснасць была ад таго што не хацела вяртацца ва ўспамінах у той час калі была маладая закаханая верыла кожнаму Васілёваму слову і гэтак неабачліва кінулася ў агонь свайго кахання як і намагалася шмат не браць да галавы пра Васілёву хваробу (Г. Далідовіч).

92. Юлька як і многія з вясковай моладзі спяшаецца на ўлюдненую ўжо і тут дыскатэку дзе яны сабраўшыся як аднойчы ўбачыла Жэня уключаюць шматколернае мігатлівае святло ад якога аж рэжа ўваччу слухаюць неверагодна грымлівую музыку крыклівыя а то і лямантлівыя песні танцуюць-таўкуцца ў вялікім гурце гэтае незвычайнае святло адмысловую музыку наладзіў новы загадчык клуба маладзы але без часу нейкі пакамячаны лысы і барадаты (Г. Далідовіч).

93. Былі ў іх [мужчын] вядома гарладзёры аднак былі і такія што песню любілі любоўю ціхай натхнёнай якая здаецца і не прыходзіць ніколі і ніколі не пакідае цябе а проста твая ўсё жыццё як сам ты з болем тваім з тваёю радасцю з тугою па нечым нязбытым што магло б што павінна было б хоць як-небудзь прыйсці але вось не ідзе... (Я. Брыль).

94. Мы ўбачылі што ты як і ўсё Палессе абудзілася ад векавога сну і пачынаеш толькі жыць новым жыццём якім магла жыць ужо некалькі стагоддзяў назад калі б людзі былі разумнейшыя менш думалі аб тым як лепей і хутчэй забіваць адзін аднаго і больш думалі аб табе аб тваіх рэках аб тваіх куточках зямлі як тваё і маё Палессе... (Б. Сачанка).

95. На Агеева тут не звярнулі вялікай ўвагі хаця ўсе хто сустракаўся яму на двары ці з цыгаркаю ў зубах бавіў час у калідоры з нядобрым халадком у вачах праводзілі яго пакуль ён ішоў наперадзе канваіра за рог калідора дзе было цішэй і жаўцелі асобныя дзверы ў сцяне (В. Быкаў).

96. Камандзір палка стаяў у акопчыку ў новай засунутай на вочы касцы якая хавала верхнюю палову яго схуднелага твару але па тым як уся яго хударлявая постаць напружылася калі ён глядзеў на Агеева той зразумеў што гэты выклік дабром для яго не скончыцца (В. Быкаў).

97. А калі там раптам па-восеньску жоўта і ўрачыста засвецяцца гаі і дубровы то пад кожнаю бярозкаю абавязкова прарэжацца

падбярозавік пад кожнай асінаю падасінавік а баравікі гэтыя асмялелыя лесяняты выходзяць на сонечныя паляны а то і нават і на самое поле з-пад змрочных ялін якія нібы квактухі крылы распусцілі ля самай зямлі галіны (Я. Сіпакоў).

98. Тады калі Альшэўскі быў малады канчаў дзесяцігодку думалася так ён паедзе ў горад скончыць інстытут здзейсніць нешта важнае значнае чым праславіць сваё імя як і мястэчка якое выпусціла яго ў свет (І. Навуменка).

99. Толькі ў ціхія ночы пад раніцу калі ападала раса і туман засцілаў усё на свеце аж не было відаць платоў за хатамі і высокага як дастаць рукой гарбатага што мядзведзь сланечніку ў гародчыку рабілася свежа і сыра (І. Пташнікаў).

100. Вось і зараз калі ўвесь лес гарыць золатам у якое ўвабрала яго восень алешнік гэты як бы не прызнае яе законаў і паводзіць сябе дзіўна ўгары ўвесь яшчэ зялёны а трава ўнізе засыпана лісцем пачарнелым скручаным як гарэлая бляха.

101. Я ўбачыў святло такой радасці на заціснутых паміж дрымучымі лясамі лугах па дарозе на Палік і з той хвіліны ні адной вясны не мог прапусціць каб там не пабываць і быў шчаслівы нават і ў выпадках калі пазніўся на гэтае свята усё роўна чуліся ў душы яго веліч урачыстасць і яго простая няхітрая прывабнасць (К. Кірэенка).

102. Праедзь па ёй [Прыпяці] памалу раз-другі скажам хоць бы ад вусця да Пінска і на ўсё жыццё запомніш і яе ціхія люстраныя плёсы і таямнічыя старыцы што заўсёды нечакана выходзяць аднекуль з густых нетраў лазняку і абрывістыя прыбярэжныя кручы скрозь паточаныя чорнымі дзірачкамі стрыжовых гнёздаў і прыгожыя пясчаныя водмелі што аж слепяць бляскам вочы на сонцы і яе дубровы на правым беразе і левабярэжныя лугі і нарэшце самую яе сціплую слухмяную і такую павольную як палескія жніўныя песні (У. Краўчанка).

103. Хто любіць і шануе красу зямлі той абавязкова бывае і шчырым яе абаронцам хто не імкнецца ўзбагаціць прыгажосць свайго краю а наадварот дазваляе сабе вынішчыць яго прыродныя багацці на таго няма надзеі ніколі ён як адшчапенец у любым выпадку можа здрадзіць Бацькаўшчыне бо ён яе не любіць не даражыць яе багаццем яе красой (К. Кірэенка).

104. Песня якая на некаторы час зачаравала ўсё і ўсіх зрабіла апошні меладычны ўзлёт і заціхла і на момант найшла такая цішыня што чутно было як недзе скубуць траву і дыхаюць стрыножаныя коні

як булькоча рэчка на вірах і шапочуць трысцё і аер у бліжняй затоцы (Т. Хадкевіч).

105. У кожнага чалавека ёсць недзе на зямлі  свая маленькая любімая родная мясціна скажам якая-небудзь Случчына або Полаччына словам такі геаграфічны куточак ад якога ў яго па сутнасці пачынаецца сапраўднае адчуванне радзімы з якім звязаны ўсе яго найлепшыя ўспаміны мары жаданні (У. Краўчанка).

# СХЕМА РАЗБОРУ СЛОВАЗЛУЧЭННЯ

**1** Выдзеліць словазлучэнне са сказа.

**2** Вызначыць пачатковую форму словазлучэння.

**3** Устанавіць тып словазлучэння:

*а)* паводле структуры (простае ці складанае);

*б)* паводле сінтаксічнай спаянасці кампанентаў (свабоднае і несвабоднае);

*в)* паводле граматычнага выражэння галоўнага слова (іменнае (назоўнікавае, прыметнікавае, лічэбнікавае, займеннікавае), дзеяслоўнае, прыслоўнае);

*г)* паводле разнавіднасці сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі: дапасаванне (поўнае / няпоўнае), кіраванне (моцнае / слабае, прыназоўнікавае / беспрыназоўнікавае), прымыканне;

*д)* паводле віда сэнсавых адносін паміж кампанентамі: (аб'ектныя, суб'ектныя, атрыбутыўныя і розныя віды акалічнасных).

**4** Вызначыць сродкі сувязі кампанентаў (канчаткі, прыназоўнікі і інш.).

## СХЕМА РАЗБОРУ ПРОСТАГА СКАЗА

**1** Знайсці граматычную аснову сказа (прэдыкатыўнае ядро) і ўстанавіць, што ён просты.

**2** Вызначыць тып сказа паводле адносін зместу да аб'ектыўнай рэчаіснасці (сцвярджальны, адмоўны – агульнаадмоўны, частковаадмоўны).

**3** Вызначыць тып сказа паводле мэты выказвання (апавядальны, пытальны, пабуджальны).

**4** Вызначыць тып сказа паводле інтанацыйнага афармлення (клічны, няклічны).

**5** Вызначыць тып сказа паводле саставу галоўных членаў (двухсастаўны, аднасастаўны (указаць тып аднасастаўнага)).

**6** Вызначыць тып сказа паводле наяўнасці або адсутнасці даданых членаў сказа (развіты, неразвіты).

**7** Вызначыць тып сказа паводле ўскладненасці (ускладнены, няўскладнены).

**8** Вызначыць тып сказа паводле паўнаты рэалізацыі структурнай схемы (поўны, няпоўны).

**9** Вызначыць тып сказа паводле чляністасці (членны (чляністы), нячленны (нечляністы)).

# СХЕМА РАЗБОРУ СКЛАДАНАГА СКАЗА

**1** Вызначыць тып сказа паводле структуры і сродкаў сувязі прэдыкатыўных частак (складаназлучаны, складаназалежны, бяззлучнікавы, камбінаванай будовы).

**2** Вызначыць колькасць прэдыкатыўных частак і абазначыць лічбамі кожную частку сказа.

**3** Назваць галоўную (ыя) і даданую (ыя) часткі.

**4** Вызначыць тып сувязі паміж прэдыкатыўнымі часткамі (злучальная, падпарадкавальная, бяззлучнікавая).

**5** Вызначыць, да чаго адносіцца кожная даданая частка (да слова, словазлучэння або да ўсёй галоўнай часткі).

**6** Назваць сродкі сувязі паміж прэдыкатыўнымі часткамі (злучнікі, злучальныя словы, інтанацыя).

**7** Вызначыць сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

**8** Назваць тыпы даданых частак.

**9** Растлумачыць знакі прыпынку.

**10** Падаць схему сказа (лінейную або графічную).

# УЗОРЫ ВЫКАНАННЯ ЗАДАННЯЎ

**Заданне 1.** З мастацкай літаратуры падабраць тэкст на 120-150 слоў, каб у ім былі аднасастаўныя, складаназлучаныя і складаназалежныя сказы. Выпісаць з тэксту 10 словазлучэнняў і зрабіць іх сінтаксічны разбор (аналіз праводзіць па схеме).

***Узоры выканання:***

1 Старожка ўжо злёгку пахрапвала ў кухні на печы, а Лабановіч усё яшчэ не лажыўся. На стале гарэла лямпа пад светлым абажурам і ляжала разгорнутая кніга, якую чытаў настаўнік. На гэты раз чытанне штось не ладзілася, і Лабановіч часта адрываўся ад кнігі, пахаджваў па пакоі і думаў. Новае месца, новыя людзі і тая работа, якую трэба было распачынаць на гэтых днях і да якой ён так доўга гатаваўся, – усё гэта займала яго думкі, і яму было лёгка і добра, бо так многа цікавага спадзяваўся ён спаткаць на першай сваёй дарозе незалежнай грамадскай працы.

Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб'ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычкамі, так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў, з гушчы якіх Лабановіч; гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу, і гэты выгляд самой мясцовасці, агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч, але ў якой таксама было многа цікавага і, на яго погляд, прывабнага.

*Колас Я. На ростанях. – Мн., 1972. – С. 12.*

x

1) новае месца – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

2) новыя людзі – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

3) работа ў школе – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным назоўнікам), слабае прыназоўнікавае кіраванне, атрыбутыўныя адносіны з дадатковым адценнем месца, канчатак і прыназоўнік;

x

4) стары аб’ездчык – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

5) разгорнутая кніга – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным дзеепрыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

6) лямпа пад абажурам – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным назоўнікам), слабае прыназоўнікавае кіраванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак і прыназоўнік;

x

7) глухі куток – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

8) некрануты край – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным дзеепрыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

9) злёгку пахрапвала – простае, свабоднае, дзеяслоўнае з залежным прыслоўем, прымыканне, акалічнасныя адносіны спосабу дзеяння, інтанацыя;

x

10) пахрапвала на печы – простае, свабоднае, дзеяслоўнае з залежным назоўнікам, слабае прыназоўнікавае кіраванне, акалічнасныя адносіны месца, канчатак і прыназоўнік.

2 Дзень быў лагодны, ціхі. Сонца ўжо даўно мінула поўдзень. Прыпарвала. На далёкім захадзе з-за зубчастых пералескаў выплывалі, як медзяныя горы, клубястыя хмары, пафарбаваныя сонцам у чырванаваты колер. Як прыгожа і велічна выступалі яны

над краем зямлі, уздымаючыся ўсё вышэй і вышэй! У іх звілістых клубках, у вычварных і невыразных абрысах таілася магутная сіла зямлі і сонца, гатовая рушыць на мірныя нівы, лясы і даліны стрэлы маланак і рэкі дажджу. Зрэдку павяваўшы ветрык зусім заспакоіўся. Настала вялікая цішыня. Быў нават нейкі неакрэслены страх у гэтай нязвыклай цішыні.

Лабановіч не мог адвесці вачэй ад купчастых грамадзін-хмар і ўвесь аддаўся чарам зямлі і неба. Калі пападаўся зручны пункт, адкуль расчыняўся шырокі краявід, ён прыпыняўся і некалькі хвілін любаваўся малюнкамі, што паўставалі перад вачамі.

За бліжэйшым узгоркам, праз які ішла дарога, тулілася малапрыкметная, закінутая чыгуначная станцыя. Некалькі шатрыстых ліп і клёнаў з аднаго канца яе і пара заняпалых таварных вагонаў з другога віднелася здалёк. Мінуўшы ўзгорак, Лабановіч апынуўся амаль на самай станцыі. Такая ж яна ціхая і бязлюдная, як і тая станцыя на Палессі, дзе ён садзіўся некалі на паязды...

*Колас Я. На ростанях. – Мн., 1972. – С. 441–442.*

x

1) чырванаваты колер – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

2) выступалі велічна – простае, свабоднае, дзеяслоўнае з залежным прыслоўем, прымыканне, акалічнасныя адносіны спосабу дзеяння, інтанацыя;

x

3) вялікая цішыня – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

4) садзіўся некалі – простае, свабоднае, дзеяслоўнае з залежным прыслоўем, прымыканне, акалічнасныя адносіны часу, інтанацыя;

x

5) садзіўся на паязды – простае, свабоднае, дзеяслоўнае з залежным назоўнікам, слабае прыназоўнікавае кіраванне, акалічнасныя адносіны месца, канчатак і прыназоўнік;

x

6) клубястыя хмары – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

7) медзяныя горы – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

8) стрэлы маланак – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным назоўнікам), слабае беспрыназоўнікавае кіраванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

9) шырокі краявід – простае, свабоднае, іменнае (субстантыўнае з залежным прыметнікам), поўнае дапасаванне, атрыбутыўныя адносіны, канчатак;

x

10) любаваўся малюнкамі – простае, свабоднае, дзеяслоўнае з залежным назоўнікам, моцнае беспрыназоўнікавае кіраванне, аб'ектныя адносіны, канчатак.

**Заданне 2.** Падкрэсліць дзейнікі ў тэксце, вызначыць іх структурныя тыпы і спосабы выражэння.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Старожка – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

Лабановіч – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

лямпа – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

кніга – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

настаўнік – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

чытанне – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
Лабановіч – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
месца – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
людзі – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, мн. ліку;
работа – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
ён – просты, марфалагізаваны, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку;
усё гэта – складаны, немарфалагізаваны, выражаны спалучэннем азначальнага і ўказальнага займеннікаў у форме Н. склону, адз. ліку, н. роду;
ён – просты, марфалагізаваны, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку;
куток – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
народ – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
Лабановіч – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
край – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
якая – просты, марфалагізаваны, выражаны адносным займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку, ж. роду;
выгляд – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
Лабановіч – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку.

Тэкст 2

Дзень – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;
сонца – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

хмары – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, мн. ліку;

яны – просты, марфалагізаваны, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. склону, мн. ліку;

сіла – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

ветрык – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

цішыня – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

страх – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

Лабановіч – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

увесь – просты, немарфалагізаваны, выражаны азначальным займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку, м. роду;

пункт – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

краявід – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

ён – просты, марфалагізаваны, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку, м. роду;

што – просты, марфалагізаваны, выражаны адносным займеннікам у форме Н. склону;

дарога – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

станцыя – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

некалькі ліп і клёнаў – складаны, выражаны спалучэннем няпэўна-колькаснага слова з назоўнікамі (аднароднымі кампанентамі) у форме Р. склону, мн. ліку;

пара вагонаў – складаны, выражаны спалучэннем назоўніка з колькасным значэннем (у форме Н. склону, адз. ліку) з назоўнікам у форме Р. склону, мн. ліку;

Лабановіч – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

яна – просты, марфалагізаваны, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку, ж. роду;

станцыя – просты, марфалагізаваны, выражаны назоўнікам у форме Н. склону, адз. ліку;

ён – просты, марфалагізаваны, выражаны асабовым займеннікам у форме Н. склону, адз. ліку, м. роду.

**Заданне 3.** Вызначыць у тэксце тыпы выказнікаў, падкрэсліць іх. Выказнікі ў адпаведнасці з іх выражэннем занесці ў табліцу. Калі ў тэксце яны адсутнічаюць, то выпісаць сказы з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку, і занесці ў табліцу.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Табліца 1. Просты дзеяслоўны выказнік і яго выражэнне

| Асабовая форма дзеяслова | Інфінітыў | Выклічніка-вая форма дзеяслова | Аналітыч-ная форма | Ускладне-ная форма | Сінтаксічна непадзел. словазл., фразеалагізм, перыфраза |
|---|---|---|---|---|---|
| пахрапвала | * не сустракаецца ў рамане | скок | буду гаварыць | ішоў і ішоў | кідалася ў вочы і затрымлівала ўвагу |
| не лажыўся | | | | | |
| гарэла | | | | | |
| ляжала | | | | | |
| чытаў | | | | | |
| не ладзілася | | | | | |
| адрываўся | | | | | |
| пахаджваў і думаў | | | | | |
| гатаваўся | | | | | |
| займала | | | | | |
| наслухаўся | | | | | |

Стараючыся не адступаць ад другіх, ён ішоў і ішоў (с.10).

Я буду гаварыць коратка (с. 118).

Як толькі ён [Турсевіч] зачыніў дзверы і замкнуў іх на засаўку, Лабановіч – скок на ганак (с. 418).

Табліца 2. Састаўны дзеяслоўны выказнік

| Звязка | | | | Прызвязачны член | |
|---|---|---|---|---|---|
| Фазавы дзеяслоў | Дзеяслоў з мадальным значэннем | Іменная часціна мовы | Сінтаксічна непадзельнае словазлучэнне | Інфінітыў | Непадзельнае словазлучэнне, фразеалагізм |
| | спадзяваўс я | | | спаткаць | |
| | не мог | | | улавіць | |
| | | павінна | | рабіць | |
| пачала | | | | уходжвацца | |
| | не мог | | | | адвесці вачэй |
| | | | * не сустракаецца ў рамане | | |

Чым сядзець на станцыі і чакаць поезда, дык ці не лепей збочыць з дарогі і яшчэ раз напомніць Лідзе, што яна павінна рабіць у яго адсутнасць (с. 441).

Бабка з палёгкай уздыхнула, перахрысціла настаўніка і пачала ўходжвацца каля кухні, успомніўшы пра госця (с. 440).

Лабановіч не мог адвесці вачэй ад купчастых грамадзін-хмар і ўвесь аддаўся чарам зямлі і неба (с. 441).

Табліца 3. Састаўны іменны выказнік

| Звязка | | | | Прызвязачны член | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тыповая | | Паў-знамя-наль-ная | Зна-мя-наль-ная | На-зоў-нік | Пры-мет-нік | Дзее-пры-мет-нік | Зай-мен-нік | Лі-чэб-нік | Пры-слоўе | Сінтак-січна непадз. слова-злучэн-не, фра-зеала-гізм |
| ма-тэр. выра-жа-ная | ну-ля-вая | | | | | | | | | |
| быў | | | | па душы | | | | | | |
| быў | | | | | | узруша ны | | | | |
| | | сталі | | | маўклі-вымі і пануры мі | | | | | |
| | | | прабі-раўся | | | | | адзін | | |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| была | | | | | | | такою | | | |
| Звязка | | | | Прызвязачны член | | | | | | |
| Тыповая | | Паў-знамя-наль-ная | Зна-мя-наль-ная | На-зоў-нік | Пры-мет-нік | Дзее-пры-мет-нік | Зай-мен-нік | Лі-чэб-нік | Пры-слоўе | Сінтак-січна непадз. слова-злучэн-не, фра-зеала-гізм |
| ма-тэр. выра-жа-ная | ну-ля-вая | | | | | | | | | |
| быў | | | | апты-мі-стам | | | | | | |
| быў | | | | | | | | | | яшчэ малады чалавек |
| | * | | | | ціхая і бязлюд ная | | такая | | | |
| | | | | | | | | | * не сустр. у рамане | |

Ён быў узрушаны тым, як многа трэба зрабіць, каб горад зноў зажыў (с. 443).

Салдаты сталі маўклівымі і панурымі (с. 445).

З гэтага дня ён прабіраўся адзін (с. 489).

Яна была зноў такою, як да той прыкрасці, да бяды, нібы і не стаяў між іх ніхто (с. 30).

Ён быў аптымістам, лейтэнант Клямт (с. 77).

Гэта быў яшчэ малады чалавек, гадоў сарака, з рыхлым, цяжкім тварам (с. 172).

Такая ж яна ціхая і бязлюдная, як і тая станцыя на Палессі, дзе ён садзіўся некалі на паязды... (с. 442).

Тэкст 2

Табліца 1. Просты дзеяслоўны выказнік і яго выражэнне

| Асабовая форма дзеяслова | Інфінітыў | Выклічніка-вая форма дзеяслова | Аналітыч-ная форма | Ускладне-ная форма | Сінтаксічна непадзел. словазл., фразеалагізм, перыфраза |
|---|---|---|---|---|---|
| мінула | * не сустракаецца ў рамане | скок | буду гаварыць | ішоў і ішоў | аддаўся чарам |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| выплывалі | | | | | |
| выступалі | | | | | |
| таілася | | | | | |
| заспакоіўся | | | | | |
| настала | | | | | |
| быў | | | | | |
| пападаўся | | | | | |
| расчыняўся | | | | | |
| прыпыняўс я | | | | | |
| любаваўся | | | | | |
| паўставалі | | | | | |
| ішла | | | | | |
| тулілася | | | | | |
| віднелася | | | | | |
| апынуўся | | | | | |
| садзіўся | | | | | |

Стараючыся не адступаць ад другіх, ён ішоў і ішоў (с.10).

Я буду гаварыць коратка (с. 118).

Як толькі ён [Турсевіч] зачыніў дзверы і замкнуў іх на засаўку, Лабановіч – скок на ганак (с. 418).

Табліца 2. Састаўны дзеяслоўны выказнік

| Звязка | | | | Прызвязачны член | |
|---|---|---|---|---|---|
| Фазавы дзеяслоў | Дзеяслоў з мадальным значэннем | Іменная часціна мовы | Сінтаксічна непадзельнае словазлучэнне | Інфінітыў | Непадзельнае словазлучэнне, фразеалагізм |
| | не мог | | | | адвесці вачэй |
| | | павінна | | рабіць | |
| пачала | | | | уходжвацца | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | * не сустракаецца ў рамане | | |

Чым сядзець на станцыі і чакаць поезда, дык ці не лепей збочыць з дарогі і яшчэ раз напомніць Лідзе, што яна павінна рабіць у яго адсутнасць (с. 441).

Бабка з палёгкай уздыхнула, перахрысціла настаўніка і пачала ўходжвацца каля кухні, успомніўшы пра госця (с. 440).

Табліца 3. Састаўны іменны выказнік

| Звязка | | | | Прызвязачны член | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тыповая | | Паўзнаменальная | Знаменальная | Назоўнік | Прыметнік | Дзеепрыметнік | Займеннік | Лічэбнік | Прыслоўе | Сінтаксічна непадз. словазлучэнне, фразеалагізм |
| матэр. выражаная | нулявая | | | | | | | | | |
| быў | | | | | лагодны, ціхі | | | | | |
| | * | | | | ціхая і бязлюдная | | такая | | | |
| была | | | | | | адчынена | | | | |
| | | сталі | | | маўклівымі | | | | | |
| | | | прабіраўся | | | | | адзін | | |
| была | | | | | | | такою | | | |
| была | | | | ідэалам | | | | | | |
| быў | | | | | | | | | | яшчэ малады чалавек |
| | | | | | | | | | * не сустр. у рамане | |

Білетная каса была ўжо адчынена (с. 443).

Салдаты сталі маўклівымі і панурымі (с. 445).

З гэтага дня ён прабіраўся адзін (с. 489).

Яна была зноў такою, як да той прыкрасці, да бяды, нібы і не стаяў між іх ніхто (с. 30).

Яна была для яго ідэалам (с. 431).

Гэта быў яшчэ малады чалавек, гадоў сарака, з рыхлым, цяжкім тварам (с. 172).

**Заданне 4.** Выпісаць з тэксту аднасастаўныя сказы, падкрэсліць галоўны член. Вызначыць тып аднасастаўнага сказа і спосаб выражэння ў ім галоўнага члена (у дужках пасля кожнага сказа). Калі аднасастаўны сказ з’яўляецца часткай складанага сказа, то трэба

выпісаць увесь складаны сказ і падкрэсліць у ім частку, якая пабудавана як аднасастаўны сказ. Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то на кожны тып аднасастаўных сказаў падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Новае месца, новыя людзі і тая работа, якую трэба было распачынаць на гэтых днях і да якой ён так доўга гатаваўся, – усё гэта займала яго думкі, і яму было лёгка і добра, бо так многа цікавага спадзяваўся ён спаткаць на першай сваёй дарозе незалежнай грамадскай працы.

... якую трэба было распачынаць на гэтых днях... (*безасабовы сказ; галоўны член выражаны спалучэннем “мадальнае слова (прыслоўе) + дзеяслоў-звязка ў форме прошлага часу + інфінітыў”*);

... яму было лёгка і добра... (*безасабовы сказ; галоўны член выражаны спалучэннем “дзеяслоў-звязка ў форме прошлага часу + прэдыкатыўныя прыслоўі (словы катэгорыі стану)”*).

Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб’ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычкамі, так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў, з гушчы якіх Лабановіч; гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу, і гэты выгляд самой мясцовасці, агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч, але ў якой таксама было многа цікавага і, на яго погляд, прывабнага.

... у якой таксама было многа цікавага і, на яго погляд, прывабнага (*безасабовы сказ; галоўны член выражаны спалучэннем “дзеяслоў-звязка ў форме прошлага часу + прыслоўе (няпэўна-колькаснае слова)”*).

Тэкст 2

Прыпарвала (*безасабовы сказ; галоўны член выражаны асабовым дзеясловам у безасабовым значэнні*).

І вось надышло 16 ліпеня. Незвычайны, непаўторны дзень (с. 502). (*намінатыўны сказ; галоўны член выражаны назоўнікам у форме Н. склону*);

Пішы мне, а я цябе пісьмамі не пакрыўджу (с. 469).

...пішы мне... (*пэўна-асабовы сказ; галоўны член выражаны дзеясловам у форме 2-ой асобы, адз. ліку, загаднага ладу*);

І толькі месяцы праз два, ужо з-за граніцы, прыслалі бліжэйшым сябрам вестку аб сваёй эміграцыі (с. 441). (*няпэўна-асабовы сказ; галоўны член выражаны дзеясловам у форме прошлага часу, мн. ліку, абвеснага ладу*);

...Так, тут мух не лаві (с. 127). (*абагульнена-асабовы сказ; галоўны член выражаны ўстойлівым спалучэннем з галоўным кампанентам дзеясловам у форме 2-ой асобы, адз. ліку, загаднага ладу; мае абагульняючае значэнне*);

– Ісці – па грэблі! Не зварочваць! (с. 64) (*інфінітыўныя сказы; галоўныя члены выражаны незалежнымі інфінітывамі*).

**Заданне 5.** Выпісаць з тэксту два сказы з аднароднымі і два сказы з неаднароднымі азначэннямі. Растлумачыць умовы аднароднасці і прычыны неаднароднасці азначэнняў у сказах (у дужках пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Новае месца, новыя людзі і тая работа, якую трэба было распачынаць на гэтых днях і да якой ён так доўга гатаваўся, – усё гэта займала яго думкі, і яму было лёгка і добра, бо так многа цікавага спадзяваўся ён спаткаць на *першай сваёй* дарозе *незалежнай грамадскай* працы. – неаднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у розных адносінах (азначэнне *першай* адносіцца да словазлучэння *сваёй дарозе*; азначэнне *незалежнай* адносіцца да словазлучэння *грамадскай працы*).

Яму па душы быў і *гэты глухі* куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад *аднаго старога* аб’ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычкамі, так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў, з гушчы якіх Лабановіч; гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу, і гэты выгляд самой мясцовасці, агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч, але ў якой

таксама было многа цікавага і, на яго погляд, прывабнага. – неаднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у розных адносінах (азначэнне *гэты* адносіцца да словазлучэння *глухі куток*; азначэнне *аднаго* адносіцца да словазлучэння *старога аб’ездчыка*).

Тэкст 2

У іх звілістых клубках, у *вычварных* і *невыразных* абрысах таілася магутная сіла зямлі і сонца, гатовая рушыць на мірныя нівы, лясы і даліны стрэлы маланак і рэкі дажджу. – аднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у аднолькавых адносінах (спалучаюцца пры дапамозе злучніка ***і***). Умовы аднароднасці: аднолькавая сінтаксічная іх функцыя ў сказе, аднолькавая сувязь з агульным для іх членам сказа, лагічная аднароднасць паняццяў, пералічальная інтанацыя.

Быў нават *нейкі неакрэслены* страх у *гэтай нязвыклай* цішыні. – неаднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у розных адносінах (азначэнне *нейкі* адносіцца да словазлучэння *неакрэслены страх*; азначэнне *гэтай* адносіцца да словазлучэння *нязвыклай цішыні*).

За бліжэйшым узгоркам, праз які ішла дарога, тулілася *малапрыкметная*, *закінутая чыгуначная* станцыя. – азначэнні *малапрыкметная*, *закінутая* з’яўляюцца аднароднымі, бо характарызуюць прадмет з аднаго боку (Умовы аднароднасці: аднолькавая сінтаксічная іх функцыя ў сказе, аднолькавая сувязь з агульным для іх членам сказа, лагічная аднароднасць паняццяў, пералічальная інтанацыя.), а азначэнні *малапрыкметная* і *чыгуначная, закінутая* і *чыгуначная* – неаднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у розных адносінах (азначэнні *малапрыкметная*, *закінутая* адносяцца да словазлучэння *чыгуначная станцыя*).

Некалькі шатрыстых ліп і клёнаў з аднаго канца яе і пара *занядалых таварных* вагонаў з другога віднелася здалёк. – неаднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у розных адносінах (азначэнне *занядалых* адносіцца да словазлучэння *таварных вагонаў*).

А пад поўнач пасыпаў сняжок, *залежны, спорны, густы* і *сухі* (с. 543) – аднародныя азначэнні, бо характарызуюць прадмет у аднолькавых адносінах (спалучаюцца пры дапамозе інтанацыі і злучніка ***і***). Умовы аднароднасці: аднолькавая сінтаксічная іх

функцыя ў сказе, аднолькавае марфалагічнае выражэнне. аднолькавая сувязь з агульным для іх членам сказа, лагічная аднароднасць паняццяў, пералічальная інтанацыя.

**Заданне 6.** Выпісаць з тэксту тры сказы з адасобленымі азначэннямі ў розным становішчы да азначаемага слова, растлумачыць умовы адасаблення (пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб'ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычкамі, *так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў*, з гушчы якіх Лабановіч; гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу, і гэты выгляд самой мясцовасці, агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч, але ў якой таксама было многа цікавага і, на яго погляд, прывабнага. – адасобленае азначэнне, выражанае прыметнікавым зваротам (прыметнік + залежныя словы), знаходзіцца пасля азначаемых слоў, выражаных назоўнікамі.

Тэкст 2

На далёкім захадзе з-за зубчастых пералескаў выплывалі, як медзяныя горы, клубястыя хмары, *пафарбаваныя сонцам у чырванаваты колер*. – адасобленае азначэнне, выражанае дзеепрыметным зваротам, знаходзіцца пасля азначаемага слова, выражанага назоўнікам.

У іх звілістых клубках, у вычварных і невыразных абрысах таілася магутная сіла зямлі і сонца, *гатовая рушыць на мірныя нівы, лясы і даліны стрэлы маланак і рэкі дажджу*. – адасобленае азначэнне, выражанае прыметнікавым зваротам (прыметнік + залежныя словы), знаходзіцца пасля азначаемага слова, выражанага назоўнікам.

*Зняверанвы, дэмаралізаваныя*, салдаты часта адставалі ад сваіх падраздзяленняў, стыхійна далучаліся да першага вайсковага натоўпу або паходнай кухні (с. 132). – адзіночныя азначэнні, выражаныя дзеепрыметнікамі, адносяцца да назоўніка і знаходзяцца перад ім, але адасабляюцца, паколькі маюць дадатколвае акалічнаснае значэнне прычыны.

Узяўшы трубку, ён, *дробны, у вялікіх ботах*, хрыплым, з басам, голасам пачаў камандваць "Амуру" прыцэл, вугламер, зарад (с. 14). – адасобленыя азначэнні, выражаныя прыметнікам і спалучэннем "прыметнік + назоўнік" (недапасаванае азначэнне), знаходзяцца пасля азначаемага слова, выражанага асабовым займеннікам. Калі азначэнне адносіцца да асабовага займенніка, то яно заўсёды адасабляецца.

**Заданне 7.** Выпісаць з тэксту два сказы з пабочнымі і два сказы з устаўнымі канструкцыямі. Растлумачыць іх значэнне і ўжыванне пры іх знакаў прыпынку (пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся, аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб'ездчыка, і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычкамі, так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў, з гушчы якіх Лабановіч; гэты некрануты край старажытнасці, якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу, і гэты выгляд самой мясцовасці, агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч, але ў якой таксама было многа цікавага і, <u>на яго погляд</u>, прывабнага. – пабочная канструкцыя (словазлучэнне) паказвае на крыніцу паведамлення, на тое, каму належыць думка, знаходзіца ў сярэдзіне сказа і з абодвух бакоў выдзяляецца коскамі.

Тэкст 2 У дадзеным тэксце пабочныя і ўстаўныя канструкцыі адсутнічаюць.

Першымі павярнулі – убачыў Аляксей – яшчэ адна бронемашына, два бронетранспарцёры, за імі – некалькі машын з салдатамі, за машынамі калаціліся дзве маленькія процітанкавыя гарматкі (с. 108). – устаўная канструкцыя (сказ) паказвае на абставіны, што суправаджаюць асноўнае паведамленне, знаходзіца ў сярэдзіне сказа і з абодвух бакоў выдзяляецца працяжнікамі.

Гэта была, лічыў генерал, разумная, неабходная перасцярога (с. 177). – пабочная канструкцыя (сказ) паказвае на крыніцу паведамлення, на тое, каму належыць думка, знаходзіца ў сярэдзіне сказа і з абодвух бакоў выдзяляецца коскамі.

Дзядзька, вы, кажуць, тут начальнік... (с. 298) – пабочная канструкцыя (суадносіцца з аднасастаўным сказам) паказвае на крыніцу паведамлення, на тое, каму належыць думка, знаходзіца ў сярэдзіне сказа і з абодвух бакоў выдзяляецца коскамі.

Пан падлоўчы быў родам дзесь з Гродзеншчыны і паходзіў, як ён казаў сам, са старога дваранскага роду (с. 41). – пабочная канструкцыя (сказ) паказвае на крыніцу паведамлення, на тое, каму належыць думка, знаходзіца ў сярэдзіне сказа і з абодвух бакоў выдзяляецца коскамі.

Зараз жа дзябёлая Акуля – яна была старожкаю пры школе і разам гаспадыняю кухні – прынесла пяць рознакаліберных талерак, столькі ж зборных відэльцаў ды пару нажоў-інвалідаў (с. 450) – устаўная канструкцыя (сказ) уносіць дадатковае паведамленне да папярэдніх слоў, знаходзіца ў сярэдзіне сказа і з абодвух бакоў выдзяляецца працяжнікамі.

**Заданне 8.** Выпісаць з тэксту чатыры складаназлучаныя сказы, назваць і падкрэсліць злучнікі, вызначыць адносіны паміж часткамі. Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

Старожка ўжо злёгку пахрапвала ў кухні на печы[1], **а** Лабановіч усё яшчэ не лажыўся[2]. (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка ***а***; супраціўныя адносіны; часткі раздзяляюцца коскай).

Схемы: 1 ,а 2 ; [ ... [1]] , а [ ... [2]].

На гэты раз чытанне штосьці не ладзілася[1], **і** Лабановіч часта адрываўся ад кнігі, пахаджваў па пакоі і думаў[2]. (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка ***і***; спалучальныя адносіны з дадатковым значэннем выніковасці; часткі раздзяляюцца коскай).

Схемы: 1 ,і 2 ; [ ... [1]] , і [ ... [2]].

Тэкст 2

Лабановіч не мог адвесці вачэй ад купчастых грамадзін-хмар[1] **і** ўвесь аддаўся чарам зямлі і неба[2]. (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка ***і***; спалучальныя адносіны з дадатковым значэннем выніковасці; часткі не раздзяляюцца коскай, паколькі дзейнік другой часткі выражаны азначальным займеннікам *увесь*, якім узмацняецца дзейнік першай часткі).

Схемы: 1 і 2 ; [ ... [1]] і [ ... [2]].

Аднак тут грукнулі дзверы з двара[1], **а** затым Ліда пачула мерны тупат ног у сенях[2] (с. 479). (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка ***а***; супраціўныя адносіны з дадатковым значэннемпаслядоўнасці; часткі раздзяляюцца коскай).

Схемы: 1 ,а 2 ; [ ... [1]] , а [ ... [2]].

Вось і паваротка на хутар[1], **і** сам ён не больш за паўвярсты ад дарогі[2] (с. 441). (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка ***і***; спалучальныя адносіны з дадатковым значэннем адначасовасці; часткі раздзяляюцца коскай).

Схемы: 1 ,і 2 ; [ ... [1]] , і [ ... [2]].

Ён вельмі ж быў поўны гэтым жыццём[1], **і** вельмі ж многа было ў гэтага жыцця горкага[2]... (с. 443). (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе спалучальнага злучніка ***і***; спалучальныя адносіны з дадатковым значэннем адначасовасці; часткі раздзяляюцца коскай).

Схемы: 1 ,і 2 ; [ ... [1]] , і [ ... [2]].

У яго пакуль не было кватэры[1], **але** ён ішоў у гарком і з другой прычыны[2] (с. 443). (складаназлучаны сказ, складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак, якія звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка ***але***; супраціўныя адносіны; часткі раздзяляюцца коскай).

Схемы: 1 ,а 2 ; [ ... [1]] , а [ ... [2]].

**Заданне 9.** Выпісаць з тэксту чатыры складаназалежныя сказы, назваць і падкрэсліць злучнікі і злучальныя словы, вызначыць адносіны паміж часткамі (пасля кожнага сказа). Калі ў тэксце адсутнічаюць сказы, то падабраць з выбранага мастацкага твора, указаўшы старонку.

***Узоры выканання:***

Тэкст 1

[ Яму па душы быў і гэты глухі куток Палесся[1], ( аб якім яшчэ дома так многа цікавага наслухаўся ад аднаго старога аб’ездчыка[2] ), і гэты народ з яго асаблівай моваю і звычкамі, так не падобнымі да мовы і звычаяў тых беларусаў[1], ( з гушчы якіх Лабановіч[3] ); гэты некрануты край старажытнасці[1], ( якая на кожным кроку кідалася яму ў вочы і затрымлівала на сабе ўвагу[4] ), і гэты выгляд самой мясцовасці[1] ], ( агульнага тону якой не мог яшчэ ўлавіць Лабановіч[5] ), але ( ў якой таксама было многа цікавага і, на яго погляд, прывабнага[6] ).

Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі (з сузалежным падпарадкаваннем); складаецца з шасці прэдыкатыўных частак: адной галоўнай і пяці даданых. Першая прэдыкатыўная частка з’яўляецца галоўнай для ўсіх астатніх.

Паміж 1-й і 2-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *(аб) якім*, выражанае адносным займеннікам з прыназоўнікам; даданая азначальная адносіцца да словазлучэння *куток Палесся* і адказвае на пытанне *які?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Паміж 1-й і 3-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *(з) якіх*, выражанае адносным займеннікам з прыназоўнікам; даданая азначальная адносіцца да словазлучэння *тых беларусаў* і адказвае на пытанне *якіх?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Паміж 1-й і 4-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *якая*, выражанае адносным займеннікам; дададая азначальная адносіцца да слова *старажытнасці* і адказвае на пытанне *які?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Паміж 1-й і 5-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *якой*, выражанае адносным займеннікам; дададая азначальная адносіцца да слова *мясцовасці* і адказвае на пытанне *якой?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Паміж 1-й і 6-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *(у) якой*, выражанае адносным займеннікам з прыназоўнікам; дададая азначальная адносіцца да слова *мясцовасці* і адказвае на пытанне *якой?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Паміж 5-й і 6-й прэдыкатыўнымі часткамі, якія з'яўляюцца аднароднымі, злучальная сувязь, сродак сувязі супраціўны злучнік *але*; адносіны супраціўныя; часткі раздзяляюцца коскамі.

Схемы:




якія? — х → [ ... [1], (аб якім ... [2]) , ... , (з якіх ... [3]) ; ... (якая ... [4]) ... [1]], (якой ... [5]) , але (у якой ... [6]).

(над злучнымі словамі: х → якія?; х → якіх?; х → якой?; х → якой?; → якой?)

Тэкст 2

( Калі пападаўся зручны пункт[1] ), ( адкуль расчыняўся шырокі краявід[2] ), [ ён прыпыняўся і некалькі хвілін любаваўся малюнкамі[3] ], ( што паўставалі перад вачамі[4] ).

Складаназалежны сказ з некалькімі дададымі (з сузалежным і паслядоўным падпарадкаваннем); складаецца з чатырох прэдыкатыўных частак: адной галоўнай і трох дададых. Трэцяя прэдыкатыўная частка з'яўляецца галоўнай для ўсіх астатніх.

Паміж 3-й і 1-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучнік *калі*; дададая акалічнасная часу

адносіцца да ўсёй галоўнай часткі і адказвае на пытанне *калі?*; адносіны акалічнасныя часу; часткі раздзяляюцца коскамі.

Трэцяя прэдыкатыўная частка, у сваю чаргу, з'яўляецца галоўнай для 2-й прэдыкатыўнай часткі, паміж якімі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *адкуль,* выражанае прыслоўем; даданая азначальная адносіцца да слова *пункт* і адказвае на пытанне *які?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Паміж 3-й і 4-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *што,* выражанае адносным займеннікам; даданая азначальная адносіцца да слова *малюнкамі* і адказвае на пытанне *якімі?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Схемы: 3

калі↓ што↓

даданая 1-й ступені 1 4

адкуль ↓

даданая 2-й ступені 2

калі?

які? ←———— якімі?

х ———→ х ———→

(Калі ... [1]) , (адкуль ... [2]) , [ ... [3]], (што ... [4]) .

[ За бліжэйшым узгоркам[1], ( праз які ішла дарога[2] ), тулілася малапрыкметная, закінутая чыгуначная станцыя[1] ].

Складаназалежны сказ; складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак: адной галоўнай і адной даданай. Даданая частка знаходзіцца ў сярэдзіне галоўнай. Паміж часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *(праз) які,* выражанае адносным займеннікам з прыназоўнікам; даданая азначальная адносіцца да слова *(за) узгоркам* і адказвае на пытанне *якім?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Схемы: 2

праз які↓

1

якім?

х ———→

[ ... [1], (што ... [2]), ... [1] ] .

[ Такая ж яна ціхая і бязлюдная[1] ], ( як і тая станцыя на Палессі[2] ), ( дзе ён садзіўся некалі на паязды...[3] )

Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі (з паслядоўным падпарадкаваннем); складаецца з трох прэдыкатыўных частак: адной галоўнай і дзвюх даданых. Першая прэдыкатыўная частка з’яўляецца галоўнай для ўсіх астатніх.

Паміж 1-й і 2-й прэдыкатыўнымі часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучнік *як і*; даданая параўнальная адносіцца да ўсёй галоўнай часткі і адказвае на пытанне *як?*; адносіны параўнальныя; часткі раздзяляюцца коскамі.

Другая прэдыкатыўная частка, у сваю чаргу, з’яўляецца галоўнай для 3-й прэдыкатыўнай часткі, паміж якімі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *дзе,* выражанае прыслоўем; даданая азначальная адносіцца да слова *станцыя* і адказвае на пытанне *якая?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскамі.

Схемы: 1

як і ↓

2 даданая 1-й ступені

дзе ↓

3 даданая 2-й ступені

як? якая?

——→ х ——→

[ ... [1]], (як і ... [2]) , (дзе ... [3]).

[ Відаць, яна баялася[1] ], ( каб маці не сказала чаго аб іх інтымных гутарках[2] ) (с. 480).

Складаназалежны сказ; складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак: адной галоўнай і адной даданай. Даданая частка знаходзіцца пасля галоўнай. Паміж часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучнік *каб*; даданая дапаўняльная адносіцца да слова *баялася* і адказвае на пытанне *чаго?*; адносіны аб’ектныя; часткі раздзяляюцца коскай.

Схемы: 1

каб ↓

2

чаго?

х ——→

[ ... [1]], (каб ... [2]).

[ У першыя хвіліны яго [Лабановіча] ахапіў жаль да сваіх сяброў$^{1}$ ], ( з якімі ён нядаўна развітаўся$^{2}$ ) (с. 468).

Складаназалежны сказ; складаецца з дзвюх прэдыкатыўных частак: адной галоўнай і адной даданай. Даданая частка знаходзіцца пасля галоўнай. Паміж часткамі падпарадкавальная сувязь, сродак сувязі злучальнае слова *(з) якімі,* выражанае адносным займеннікам з прыназоўнікам; даданая азначальная адносіцца да слова *(да) сяброў* і адказвае на пытанне *якіх?*; адносіны атрыбутыўныя (азначальныя); часткі раздзяляюцца коскай.

Схемы:

1
з якімі ↓
2

якіх?
х ———→
[ ... $^{1}$], (з якімі ... $^{2}$).

**Заданне 10.** Спісаць сказ, паставіць знакі прыпынку, зрабіць поўны сінтаксічны разбор складанага сказа.

***Узоры выканання:***

?????????????????????????

## ЛІТАРАТУРА


1 Абабурка, М.В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў [Тэкст] / М.В. Абабурка. – Мн., 1992.

2 Арутюнова, Н.Д. Предложение и его смысл [Текст] / Н.Д. Арутюнова. – М.: Наука, 1976. – 383 с.

3 Бабайцева, В.В. Система членов предложения в современном русском языке [Текст]: учебное пособие для студентов пед. ин-тов по спец. № 2101 «Рус. яз. и лит.» / В.В. Бабайцева – М.: Просвещение, 1989. – 159 с.

4 Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя [Тэкст] : вучэб. дапаможнік для студэнтаў фак. педагогікі і методыкі пачатк. навучання / Я.М. Адамовіч, Л.А. Акаловіч, В.А. Бекіш [і інш.]; Пад рэд. Я.М. Адамовіча. – Мн.: Выш. шк., 1989. – 303 с.

5 Беларуская мова: У 2 ч.: Ч. 2. Сінтаксіс [Тэкст]: падручнік / Я.М. Адамовіч, Н.І. Бурака, Л.М. Грыгор’ева і інш.; Пад рэд. Л.М. Грыгор’евай. – 4-е выд. – Мн.: Выш. шк., 2004. – 222 с.

6 Бурак, Л.І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя [Тэкст]: вучэб. дап. для філалаг. фак. ун-таў / Л.І. Бурак. – Мн.: выд-ва «Універсітэцкае», 1987. – 320 с.

7 Граматыка беларускай мовы: У 2 т. Т. 2. Сінтаксіс [Тэкст]. – Мн., 1966.

8 Золотова, Г.А. Коммуникативные аспекты русского синтаксиса [Текст] / Г.А. Золотова. – М.: Наука, 1982. – 368 с.

9 Золотова, Г.А. Синтаксический словарь. Репертуар элементарных единиц русского синтаксиса [Текст] / Г.А. Золотова. – М.: Наука, 1988. – 440 с.

10 Касаткин, Л.Л. и др. Краткий справочник по современному русскому языку [Текст] / Л.Л. Касаткин; Под ред. П.А. Леканта. – М.: Высш. школа, 1991.– 383 с.

11 Кодухов, В.И. О двух основных аспектах предложения [Текст] / В.И. Кодухов // Теоретические проблемы синтаксиса современных индоевропейских языков / Редкол.: В.Г. Адмони (отв. ред.) [и др.] – М.: Наука, 1975. – С. 33–40.

12 Лепешаў, І.Я. Практыкум па беларускай мове [Тэкст]: вучэб. дапам. / І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, К.М. Панюціч. – Мн.: Універсітэцкае, 2001. – 320 с.

13 Лингвистический энциклопедический словарь [Текст] / Гл. ред. В.Н. Ярцева. – М.: Сов. энциклопедия, 1990. – 685 с.

14 Ломтев, Т.П. Структура предложения в современном русском языке [Текст] / Т.П. Ломтев / Под ред. Н.Д. Арутюновой. – М.: Изд-во Московского ун-та, 1979. – 198 с.

15 Малажай, Г.М. Зваротак [Тэкст] / Г.М. Малажай // Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мн., 1994.

16 Малажай, Г.М. Устаўныя канструкцыі [Тэкст] / Г.М. Малажай // Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мн., 1994.

17 Михневич, А.Е. Проблемы семантико-синтаксического исследования белорусского языка. Автореф. дис. … д-ра филолог. наук: 10. 02. 01 / А.Е. Михневич. – Мн., 1976. – 44 с.

18 Міхневіч, А.Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы [Тэкст] / А.Я. Міхневіч / Рэд. В.У. Мартынаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976. – 264 с.

19 Міхневіч, А.Я. Словазлучэнне [Тэкст] / А.Я. Міхневіч // Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мн., 1994.

20 Москальская, О.И. Проблемы системного описания синтаксиса (на материале немецкого языка) [Текст]: учебное пособие. – 2-е изд., перераб. и доп. / О.И. Москальская. – М.: Высш. школа, 1981. – 175 с.

21 Наркевіч, А.І. Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове: Структурна-семантычнае апісанне [Тэкст] / А.І. Наркевіч. – Мн., 1972.

22 Норман, Б.Ю. Универсальное и специфическое в синтаксических моделях славянских языков: X Междунар. съезд славистов. Доклады [Текст] / Б.Ю. Норман. – Мн.: Университетское, 1988. – 28 с.

23 Падгайскі, Л.П. Словазлучэнне ў беларускай мове: Дзеяслоўна-іменныя словазлучэнні з акалічнаснымі адносінамі [Тэкст] / Л.П. Падгайскі. – Мн., 1971.

24 Пешковский, А.М. Русский синтаксис в научном освещении. – 7-е изд. [Текст] / А.М. Пешковский – М.: Учпедгиз, 1956. – 512 с.

25 Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні [Тэкст]: дапам. / В.І. Рагаўцоў. – Мн.: Універсітэцкае, 2001. – 199 с.

26 Сіўковіч, В.М. Беларуская мова ў пытаннях і адказах [Тэкст]: дапаможнік для вучняў старэйшых класаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання / В.М. Сіўковіч. – 4-е выд. – Мн.: УніверсалПрэс, 2007. – 592 с.

27 Современный русский язык [Текст]: учебник / Под ред. В.А. Белошапковой. – М.: Высш. школа, 1981. – 560 с.

28 Сулейманова, О.А. Проблемы русского синтаксиса [Текст] / О.А. Сулейманова. – М: Наука, 1999. – 148 с.

29 Сусов, И.П. Предложение как объект лингвистической семантики [Текст] / И.П. Сусов // Проблемы синтаксической семантики: Материалы науч. конф.– М., 1976. – С. 244–245.

30 Сучасная беларуская мова [Тэкст]: вучэб. дапам. / Л.М. Грыгор’ева [і інш.]; пад агул. рэд. Л.М. Грыгор’евай. – Мн.: Выш. шк., 2006. – 559 с.

31 Цыбульская, С.І. Даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы [Тэкст] / С.І. Цыбульская, І.У. Каліцэня. – 2-е выд. – Мн.: ТетраСистемс, 2006. – 272 с.

32 Шахматов, А.А. Синтаксис русского языка. – 2-е изд. [Текст] / А.А. Шахматов. – Л.: Гос. учебно-пед. изд-во наркомироса РСФСР. – Ленинградское отд-ние, 1941. – 620 с.

33 Яўневіч, М.С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы [Тэкст]: падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей установ, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М.С. Яўневіч, П.У. Сцяцко. – Мн.: Аверсэв, 2006. – 286 с.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА КУРСУ “СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА. СІНТАКСІС”

1 Прадмет і задачы сінтаксісу.
2 Сувязь сінтаксісу з іншымі раздзеламі мовазнаўства.
3 Асноўныя аспекты вывучэння сінтаксісу. Асноўныя сінтаксічныя адзінкі.
4 Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.
5 Класіфікацыя словазлучэнняў.
6 Прэдыкатыўныя і непрэдыкатыўныя словазлучэнні.
7 Паратаксічная і гіпатаксічная сувязі ў словазлучэннях.
8 Сэнсавыя адносіны паміж кампанентамі ў словазлучэннях.
9 Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.
10 Просты сказ як сінтаксічная адзінка. Класіфікацыя простых сказаў.
11 Парадак слоў у сказе. Месца галоўных членаў у сказе. Месца даданых членаў у сказе.
12 Двухсастаўны сказ. Яго будова. Паняцце структурнай схемы сказа (NV).
13 Паняцце аб членах сказа.
14 Дзейнік. Тыпы дзейніка і спосабы іх выражэння.
15 Выказнік. Структурна-семантычныя тыпы выказнікаў.
16 Дзеяслоўны выказнік і спосабы яго выражэння.
17 Іменны выказнік і спосабы яго выражэння.
18 Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.
19 Агульнае паняцце даданых членаў сказа.
20 Азначэнне. Дапасаванае і недапасаванае азначэнне.
21 Прыдатак. Яго функцыі і граматычнае выражэнне.
22 Дапаўненне. Яго тыпы і спосабы граматычнага выражэння.
23 Акалічнасць. Яе тыпы і спосабы граматычнага выражэння.
24 Размежаванне даданых членаў сказа.
25 Аднародныя члены сказа як сінтаксічная катэгорыя. Функцыі аднародных членаў сказа.
26 Абагульняючыя словы пры аднародных членах сказа.
27 Знакі прыпынку пры аднародных членах.
28 Злучнікі пры аднародных членах сказа. Адкрытыя і закрытыя рады аднародных членаў.
29 Аднародныя і неаднародныя азначэнні.
30 Паняцце адасобленых членаў сказа. Умовы адасаблення.

31 Функцыі адасобленых членаў сказа.
32 Адасабленне азначэнняў і знакі прыпынку пры іх.
33 Адасабленне акалічнасцей і знакі прыпынку пры іх.
34 Адасабленне дапаўненняў і далучальных членаў сказа. Знакі прыпынку пры іх.
35 Паняцце пабочных слоў, словазлучэнняў, сказаў.
36 Структура пабочных канструкцый.
37 Функцыя і значэнне пабочных канструкцый.
38 Устаўныя словы, словазлучэнні, сказы.
39 Структура, функцыя і значэнне ўстаўных канструкцый.
40 Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.
41 Паняцце звароткa. Функцыі і спосабы выражэння звароткa.
42 Тыпы звароткаў і іх месца ўсказе. Знакі прыпынку пры зваротках.
43 Параўнальныя звароты.
44 Адрозненне параўнальных зваротаў ад дададаных параўнальных частак складаназалежных сказаў.
45 Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах.
46 Агульная характарыстыка аднасастаўных сказаў. Структурна-семантычныя асаблівасці аднасастаўных сказаў.
47 Іменныя аднасастаўныя сказы.
48 Дзеяслоўныя аднасастаўныя сказы.
49 Няпоўныя сказы. Разнавіднасці няпоўных сказаў.
50 Нячленныя сказы. Разнавіднасці нячленных сказаў.
51 Складаны сказ. Класіфікацыя складаных сказаў.
52 Складаназлучаны сказ. Разнавіднасці адносін паміж часткамі складаназлучаных сказаў.
53 Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах.
54 Складаназалежны сказ. Прынцыпы класіфікацыі складаназалежных сказаў.
55 Складаназалежныя сказы нерасчлянёнай структуры.
56 Складаназалежныя сказы расчлянёнай структуры.
57 Складаназалежныя сказы з некалькімі дададанымі.
58 Складаназалежныя сказы з сузалежным падпарадкаваннем.
59 Складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем.
60 Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах.
61 Бяззлучнікавы складаны сказ. Прынцыпы класіфікацыі.
62 Бяззлучнікавыя складаныя сказы з аднатыпнымі часткамі.
63 Бяззлучнікавыя складаныя сказы з разнатыпнымі часткамі.
64 Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах.

65 Сказы камбінаванай будовы.
66 Спосабы перадачы чужой мовы.
67 Простая мова і знакі прыпынку пры простай мове.
68 Ускосная і няўласна-простая мова.
69 Асновы беларускай пунктуацыі.
70 Класіфікацыя знакаў прыпынку. Іх ужыванне.

Вучэбнае выданне

**Бобрык Уладзімір Андрэевіч**
**Малашанка Наталля Паўлаўна**

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА. СІНТАКСІС

## Заданні да кантрольных работ для студэнтаў завочнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія»

У аўтарскай рэдакцыі

Падпісана ў друк 26.04.07 (21). Фармат 60х84 1/16. Папера пісчая №1. Гарнітура "Таймс". Ум. др. арк. 5,0. Ул.-выд. арк. 3,9. Тыраж 50 экз.

Аддрукавана з арыгінала-макета
ўстановы адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны"
246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104